Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

# ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мін. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 135 (4040)
СУБОТА, 23 мая
1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

# На аснове гаспадарчага разрахунку выканаць прамфінплян

Ажыцьцяўленьне народна-гаспадарчага пляну трэцяга году пяцігодкі, выражэньне гістарычнай задачы заваяваньня пабудовы фундаменту сацыялістычнай эканомікі вызначаецца перш за ўсё выкананьнем сваіх заданьняў прамысловасьцю—тэтым вядучым пачаткам рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі.

Прамысловасьць БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, увесь час ішла па шляху няўхільнага **РОСТУ** і дасягнула, на аснове генэральнай лініі партыі, вялізарных посьпехаў на ўсіх вучастках, год за годам павялічваючы **размах** сваёй работы, бяручы ўсё больш і больш **высокія** тэмпы разьвіцьця.

Аднак, пры ацэнцы работы прамысловасьці мы павінны падыходзіць ня толькі з пункту гледжаньня перавышэньня аб'ёму пляну мінулых год, а з меркай выкананьня тых заданьняў, якія даў партыяй і ўрадам на **ДАНЫ** адрэзак часу. Нікольні не зьмяншаючы ўсяго вялізарнага значэньня **тэндэнцыі бесьперапыннага росту, пад'ёму прамысловасьці**, мы можам прызнаць адзіным законным крытэрыям яе работы выкананьне прамфінпляну на даны квартал, даны месяц, дэкаду, пяцідзеньку.

І з гэтага пункту погляду мы вымушаны з усёй рашучасьцю канстатаваць, што **прызнаць работу прамысловасьці БССР за апошні час здавальняючай ніяк нельга.**

Прамфінплян за першы квартал выкананы толькі на 85,5 проц. Ня прынёс пералому і красавік месяц, які даў нават некаторае зьніжэньне—83,5 проц.

Ня гледзячы на тое, што ў красавіку валавая прадукцыя ў параўнаньні з гэтым-жа месяцам 1930 году склала 128 проц. (у цэнкавым выражэньні), а агульны вынік 4 месяцаў (студзень—красавік) адпаведна роўны 140,6 проц.—ня гледзячы на гэтыя **бясспрэчныя дасягненьні**, баланс прамысловасьці БССР—85 проц. пляну першага кварталу і красавіка—з пункту погляду **заданьняў пяцігодкі** нас здаволіць ні ў якай меры **ня можа** і недавыкананьне праграм, якое стварылася, павінна разглядацца як трывожны сыгнал для ўсёй пралетарскай грамадзкасьці.

Дзе хаваюцца карэньні зла? На чым трэба згрупаваць увагу, каб выраўняць фронт?

Апартуністычныя элементы, выконваючы сацыяльны заказ клясавага ворага, зразумела, не абмінуць выцягнуць з свайго арсэналу зброю паклёпу на генэральную лінію партыі, пусьціць у ход заіржавелыя рапіры мінімалісцкіх установак, павесьці атаку на вызначаныя партыяй тэмпы разьвіцьця, «апраўдаць» прарывы аб'ектыўнымі труднасьцямі.

Спробы з негодными сродкамі! Партыя і рабочая кляса добра ведаюць цану падобнага роду «тэорыям» і дадуць зьнішчальны адпор усім спробам цягнуць нас назад, спробам затрымаць пераможны ход будаўніцтва сацыялізму.

Праўда, прамысловасьць сустракала на шляху выкананьня сваіх праграм некаторыя труднасьці. Па асобных галінах адчуваўся недахоп сырцу. Апалавы баланс па асобных прадпрыемствах быў напружаным. Труднасьці меліся і па лініі транспарту.

Але было-б **зусім ня верна** шукаць тлумачэньня недавыкананьня вытворчых праграм толькі ў гэтых труднасьцях росту, ня бачыць за імі **ўсёй тэй сумы** пытаньняў, якія вызначаюць умовы перамогі ў барацьбе за прамфінплян.

Справа заключаецца ў тым, што напружаныя заданьні трэцяга году, нямінучыя труднасьці росту прад'яўляюць прамысловасьці катэгарычныя патрабаваньні **карэннай перабудовы работы на аснове ўкараненьня жорсткага гаспадарчага разрахунку, на аснове поўнай мабілізацыі ўсіх унутраных рэсурсаў, рашучага паляпшэньня тэхнічнага і апэрацыйнага кіраўніцтва.**

Так, і толькі так, можа зараз стаяць пытаньне. Між тым, прыходзіцца з усёй пэўнасьцю ўстанавіць, што прамысловасьць БССР яшчэ ня здолела ў дастатковай ступені **перабудаваць** сваю работу ў адпаведнасьці з гэтымі патрабаваньнямі, што факты работы па старынцы, на жаль, далёка не адзінкавыя.

Возьмем пытаньне аб **СЫРЦОВАЙ БАЗЕ.** У нас неяк ужо ўвайшло ў моду гаварыць аб недахваце сырцу, «апраўдваць» гэтыя прарывы, хаця труднасьці перажываюць **толькі асобныя** галіны прамысловасьці. Для цэлага раду галін гэта пытаньне **зусім** не зьяўляецца актуальным. Больш таго, трэба проста сказаць, што ў радзе выпадкаў больш вядзецца **разважаньняў** аб недахваце сырцу, чым **барацьбы за зьмякчэньне** гэтага недахвату.

Вельмі паказальным у гэтых адносінах зьяўляецца той факт, што на фабрыках і заводах за першы квартал выяўлена **ЛІШНІХ ФОНДАЎ** на суму 716.918 руб., у красавіку—на 221.349 р. Яшчэ больш недацушчальным зьяўляецца тое, што з гэтых выяўленых лішніх фондаў засталося **НЕРАЗЬМЕРКАВАНЫМІ** на суму 231 т. руб., у першым квартале і на 189 тыс. руб. у красавіку.

Пры сапраўдных затрудненьнях з матэрыял-сырцом пытаньне аб **МАБІЛІЗАЦЫІ МЭТАЛЯЛОМУ** стаіць надзвычай дрэнна. Плян за першы квартал выкананы толькі на 30,7 проц. па чорных мэталях і на 34,6 проц.—па каляровых.

**ВЫДАТКАВАНЬНЕ СЫРЦУ** даволі часта ўсё яшчэ робіцца сапраўды барбарскім спосабам. Устаноўленыя нормы скрозь і ўсюды **ня выконваюцца.** Напрыклад, у лютым на запалкавай фабрыцы «Вэзуві» выдаткаваньне ольхі складала 123 проц. супроць пляну, па Віцебскай гарбарні выдатак танідаў кар'явых—156,8 проц., па фанэрным заводзе «Вэзуві» — выдатак ольхі—129 проц. і г. д.

Нялепшае становішча і ў галіне **ЭКАНОМІІ АПАЛУ.** Дырэктыва партыі аб 15 проц. эканоміі сыстэматычна ня выконваецца. **Перазапал — звычайнае зьявішча.** Шкляная прамысловасьць, напрыклад, мае цэлых 53 проц. перавыдатку.

Аб чым гавораць усе гэтыя факты? Яны сьведчаць, што **сапраўдная барацьба за мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў яшчэ не разгарнулася, што ў гэтай галіне непачаты край работы.**

Трэба рашуча ўдарыць па апартуністычных хныканьнях, па «разважаньнях», аб «беспэрспэктыўнасьці» асобных галін прамысловасьці, **СУР'ЁЗНА** ўзяцца за работу па **мабілізацыі, правільным разьмеркаваньні і эканомным выдаткаваньні** наяўных рэсурсаў.

**ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК** зьяўляецца магутным вагаром барацьбы за выкананьне прамфінпляну, за выкананьне кольканых і якасных заданьняў. Радам пастаноў партыі і ўраду ён прызнан **асноўным прынцыпам сацыялістычнага гаспадараньня.**

Аднак, гэта важнейшае мерапрыемства ажыцьцяўляецца **недапушчальна марудна.** Гаспадарчы разрахунак яшчэ не ўкараніўся ва ўсе зьвяньні заводскага мэханізму. Толькі дзе-нідзе прыступлена да афармленьня ўзаемаадносін на аснове гаспадарчага разрахунку паміж заводакіраўніцтвам і цэхамі, **унутры-жцэхаў**, аддзяленьняў, брыгад у гэтых адносінах яшчэ амаль нічога ня зроблена.

Ажыцьцяўленьне ўсіх мерапрыемстваў, якія зьвязаны з новымі напраўкамі да крэдытнай рэформы ў цэлым, па лініі прамысловасьці праходзіць надзвычайна марудна, **без актыўнага ўдзелу ў ім шырокіх рабочых мас.** Да гэтага часу яшчэ **ня скончана дагаворная кампанія,** ня выпраўлены дэфэктныя дагавары. Ня ўсюды афармлены ўсе дакументы, неабходныя **для адкрыцьця крэдытаў.** Маюцца не адзінкавыя факты **скажэньня** новай сыстэмы крэдытаваньня, рознабой, няведаньне тэхнікі гаспадарчага разрахунку, затаварваньне. Аб'яднаньні да гэтага часу яшчэ не падыйшлі цалкам да ўсіх гэтых пытаньняў, зусім недастаткова дапамагаюць сваім прадпрыемствам.

Пытаньні **ПАЛЯПШЭНЬНЯ ТЭХНІЧНАГА І АПЭРАЦЫЙНАГА КІРАЎНІЦТВА** набываюць зараз выключна важнае значэньне. Гэтага настойліва патрабуюць прынцыпы гаспадарчага разрахунку. Гібкасьць, манэўранасьць зьяўляюцца неабходнай ўмовай пасьпяховага гаспадараньня.

Максымальная загрузка абсталяваньня, рацыяналізацыя ўсіх вытворчых працэсаў, поўнае ажыцьцё арганізацыйных непаладак—першачарговая задача.

На жаль, аднак, нельга сказаць, што і ў гэтай прамысловасьці дабіліся сур'ёзных зрухаў. Непаваротлівасьць, фіксаваньне прарываў замест іх **папярэджаньня**—усё гэта мае яшчэ месца. Целыя зьмены, **начныя** ў асаблівасьці, нярэдка застаюцца бяз тэхнічнага кіраўніцтва, без адміністрацыйнага нагляду.

Выкананьне прамфінпляну — лепшы паказальнік становішча **ПАРТЫЙНАЙ І ПРАФЭСЫЯНАЛЬНАЙ РАБОТЫ** на вытворчасьці. Вынікі першага кварталу і красавіка з дастатковай нагляднасьцю сьведчаць аб тым, што ў радзе выпадкаў у гэтай галіне маюцца буйныя недахопы. Пытаньні канкрэтызацыі кіраўніцтва вытворчым жыцьцём прадпрыемства, кіраўніцтва ўдарніцтвам, барацьбой за аўладаньне навукай вытворчасьці—павінны прыцягнуць самую сур'ёзную ўвагу вытворчых партыйных і прафсаюзных арганізацый, павінны стаць як цэнтральныя задачы сёнешняга дня.

Аналіз прычын невыкананьня прамфінпляну з усёй нагляднасьцю гаворыць, што асноўнай з іх па-ранейшаму застаецца тое, аб чым гаварыў **тав. Сталін** на ўсесаюзнай канфэрэнцыі работнікаў прамысловасьці: **«не хапіла ўмень ня выкарыстаць наяўныя магчымасьці, не хапіла ўменьня правільна кіраваць вытворчасьцю».** Адсюль трэба рабіць і адпаведныя вывады.

**Дасягненьні перадавых прадпрыемстваў, якія выканалі і перавыканалі прамфінплян за красавік («КАМІНТЭРН»—102,7 проц., «СЬЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ»—121,1 проц., «ПАЛЕСДРУК»—101 проц., ФАБРЫКА ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА—134,2 проц., ВІЦЕБСКАЯ АБТУКОВАЯ і г. д.), пішні раз пацьвярджаюць, што там, дзе выразна было пастаўлена кіраўніцтва, правільна арганізавана работа—там посьпех забясьпечан.**

Даючы бязьлітасны адпор апартуністычным элементам, паднімаючы ўсё вышэй і вышэй хвалю сацыялістычнага спаборніцтва, укараняючы гаспадарчы разрахунак ва ўсе поры прамысловага арганізму, мы, бязумоўна, даб'емся рашучага пералому ў барацьбе за прамфінплян, выканаем адказныя заданьні трэцяга году пяцігодкі.

# Інтэрвэнты рыхтуюцца

У той час, калі краіна Саветаў ідзе гігантскімі крокамі наперад у пабудове сацыялізму, калі ў нас ліквідавана беспрацоўе, калі 50 проц. усіх сялянскіх гаспадарак Саюзу калектывізавана,—**капіталістычны сьвет усё больш развальваецца, рэвалюцыйны рух ва ўсім сьвеце бурнай хваляй накоўшы усё больш магутныя ўдары ў фундамант загніваючага капіталізму.** Драпежнікі ў пэніцы. Савецкі Саюз яны абвінавачваюць ужо за **адно тое,** што ён бурна разьвіваецца, што ня ведае беспрацоўя, што жыцьцё ў ім бурліць.

Імпэрыялістычная зграя рыхтуецца нанесьці Савецкаму Саюзу ўдар, каб зьнішчыць ненавісную ёй першую ў сьвеце пралетарскую дзяржаву, адно існаваньне якой рэвалюцыянізуе капіталістычных рабоў — працоўных усяго сьвету, і знайсьці выхад з гаспадарчага тупіку.

З таго моманту, калі імпэрыялісты пераканаліся, што савецкая пяцігодка ня «хворая фантазія бальшавікоў», ня блёф і ня ўтопія, а **рэальная рэч,**—антысавецкая кампанія ні на адзін момант ня спынялася, дасягаючы ў пэўныя перыяды свайго апагея. Зараз правакацыйныя выпады супроць СССР імпэрыялістаў становяцца больш частымі. Толькі на працягу аднаго **апошняга тыдня мы маем зноў цэлы рад антысавецкіх правакацый,** якія маюць на мэце скрававаньне вайны супроць СССР. **Антысавецкія дэманстрацыі фінскіх фашыстаў перад будынкам савецкага паўпрэдства ў Гельсінгфорсе, падрыхтоўка паходу франтавікоў-фашыстаў да граніцы СССР, антысавецкі выпад прадстаўніка Латвійскага ўраду, правакацыя польскага фашызму ў Падбродзьдзі** з мэтаю новага крывавага нагрому рэвалюцыйна-вызваленчага руху працоўных Зах. Беларусі, для падрыхтоўкі пляцдарму будучай вайны з Савецкім Саюзам, **мілітарызацыя ўсяго фашыцкага апарату ў Бэсарабіі**—усё гэта **не паасобныя зьявішчы, а зьвяньні аднаго распрацаванага генштабам пляну—падрыхтоўкі ўзброенага нападу на СССР.**

Некалькі дзён назад тэлеграф прынёс нам весткі аб новай антысавецкай вылазцы ангельскіх цьвердалобых, на гэты раз самога **Чэмбэрлена.** Выступленьне Чэмбэрлена зьяўляецца сыгналам для ўзмацненьня антысавецкай кампаніі на ўсім фронце. Як паведамляе буржуазная ангельская прэса, «Таварыства па барацьбе з нявольніцтвам» ужо перадала Гендэрсону антысавецкі паклёпніцкі даклад аб «прымусовай працы» ў СССР. «Таймс» таксама паведамляе сваіх чытачоў, што на будучым тыдні пачне друкаваць новую сэрыю артыкулаў аб «умовах **працы ў СССР на пасазгатоўках».**

І вось, як-бы па ўказцы дырыжэрскай палачкі, праз пару дзён пасьля выступленьня Чэмбэрлена, мы маем новую антысавецкую правакацыю польскага фашызму, на гэты раз ужо ў Львове. Як падае тэлеграф, у Львове ў сувязі з паведамленьнямі ў польскім друку аб рэалізацыі пяцігодкі ў СССР і недахопе там рабочай сілы, у консульства пачалі зьяўляцца беспрацоўныя з просьбаю накіраваць іх на работу ў Савецкі Саюз. Наплыў беспрацоўных з кожным днём узрастае. 19 мая пешая і конная паліцыя пачала разганяць беспрацоўных, робячы сярод іх арышты. З гэтай прычыны, як па камандзе, фашыцкая прэса ўзьняла шалёнае, антысавецкае выцьцё з нагрозамі па адрасе консульства. Пад наглымі, крыклівымі загалоўкамі «савецкае паўпрэдзтва агітуе сярод беспрацоўных», «загадачная махінацыя бальшавікоў у Львове» і аб тым, што дэманстрацыі беспрацоўных нібы арганізаваны самім савецкім паўпрэдзтвам і г. д.,—фашыцкі друк патрабуе ўмяшаньня польскай улады.

Як вядома ўжо, савецкае консульства ў Львове апублікавала заяву, што вярбоўкай рабочай сілы для СССР яно не займаецца, а адначасова савецкае пасольства ў Варшаве перадала пратэст польскаму міністэрству замежных спраў.

Фашыцкая Польшча вядома па ўсім сьвеце, як краіна клясычнага тэрору і правакацыі. Ужо ў часе працэсу ахраньніка Палянскага, савецкі друк зазначаў, што фашыцкае правасудзьдзе з усіх сіл імкнулася захаваць тыя антысавецкія сілы, якія сталі за сьпіною гэтага обэр-правакатара і ахраньніка. А гэта сьведчыць аб тым, што **польскі фашызм не адмовіўся ад правакаваньня канфлікту з СССР, ад сваёй авантурніцкай палітыкі ў адносінах да Савецкага Саюзу.**

Трэба адзначыць таксама, што Львоўская правакацыя не выпадковасьць, яна даўно ўжо падрыхтоўвалася фашыцкай ахранкай. **Ужо калі месяца таму назад у польскай фашыцкай прэсе былі намёкі на савецкага консула ў Львове, што нібы ён вядзе перагаворы з украінскімі палітычнымі дзеячамі.**

Львоўскія ахраньнікі чакалі толькі больш спрыяючага моманту.

Як відаць з усіх гэтых антысавецкіх выступленьняў ангельскіх цьвердалобых, фінляндзкіх, польскіх і латвійскіх фашыстаў, зараз наглядаецца ўзмацненьне антысавецкай правакацыйнай кампаніі **на ўсім фронце ад Бальтыцкага да Чорнага мора.** Прычым, трэба падкрэсьліць, што **правакацыйныя выпады фінляндзкага і польскага фашызму супроць СССР ў апошнія часы становяцца ўсё больш наглымі.**

**Якімі цынічнымі зьяўляюцца пасьля ўсяго гэтага сапаўіныя трэлі пана Запескага** ў Жэнэве аб тым, што **«нідзе ня рыхтуюцца ніякія пляны аб кааліцыях супроць СССР, што ніякі ўэрапэйскі ўрад ня думае аб стварэньні кааліцыі супроць Савецкага Саюзу».** Але ня першы раз п. Залескі выступае з такімі заявамі аб «мірнай» палітыцы фашыцкага ўраду Польшчы. Больш таго. Трэба падкрэсьліць, што іменна ў той час, **калі ваенная пагроза з боку авантурніцкай палітыкі польскага фашызму зьяўляецца найбольш пагражаючай, у той час, калі антысавецкая кампанія фашыцкай прэсы дасягае свайго апагея,—іменна ў такія моманты п. Залескі выступае з самымі «мірнымі» заявамі аб «мірнай» палітыцы свайго ўраду.** Але на тое і буржуазная дыпляматыя, каб утойваць сапраўдныя мэты сваіх генштабаў.

Нельга абыйсьці моўчкі зараз і тэй хвалі белага тэрору, якая ўзмацняецца ў апошнія часы **не па днёх, а па гадзінах.** Не гаворачы ўжо аб першамайскіх расстрэлах рабочых дэманстрацый, на працягу апошняй толькі пары дзён адбыліся **расстрэлы бастуючых гарнякоў у Кракаўскім вугольным басэйне, расстрэл рабочых у Бельску** і інш. Крывавы тэрор узмацняецца. **Агнём і мячом фашызм падрыхтоўвае тыл для ваеннай авантуры супроць Савецкага Саюзу.**

Працоўныя масы Савецкага Саюзу, **асабліва яго фарпосту—БССР,** павінны пільней сачыць за падзеямі на Захадзе. Ваенная небясьпека ўзмацняецца. Працоўныя Савецкага Саюзу, занятыя мірным будаўніцтвам сацыялізму ў сваёй краіне, павінны быць на варце, каб у кожную хвіліну даць зьнішчальны адпор абнаглеўшым інтэрвентам.

Мы напамінаем фашыцкім падпальшчыкам вайны наступнае месца з рэзалюцыі VI зьезду Саветаў СССР: **«Узброены напад на СССР азначае цяпер галоўную небясьпеку для тых, хто адважыцца парушыць мір і напасьці на Савецкі Саюз».** А што гэта так, дык красамоўным довадам служаць першамайскія дэманстрацыі пралетарыяту ў гэтым годзе ва ўсім сьвеце. Фашыцкая-ж Польшча, якая знаходзіцца на краі катастрофы, павінна асабліва прыадумацца над гэтым

## СПУСК НЯМЕЦКАГА БРАНЯНОСЦА

БЭРЛІН. 19-га мая ў Кіле адбыўся спуск на ваду новага нямецкага лінейнага карабля. Гэты карабель, як вядома, быў пабудаван па ініцыятыве **сацыял-дэмакратычнага ўраду Мюлера.**

У ваенна-морскіх колах лічаць новы лінкор **«цудам ваеннай тэхнікі».** Упяршыню пры пабудове гэтага карабля былі ўжыты лёгкія мэталі якія змацаваны не заклёпкай, **а электрычнай зваркай,** што значна зьмяншае агульную вагу ўсяго карабля. Хуткасьць ходу—26 вузлоў пры вадазьмяшчэньні **ў 10.000 тон.** Есьць прылады, якія даюць магчымасьць **праходзіць праз мінныя палі.** (ТАСС).

# Правакацыйныя замахі ў Падбродзьдзі—

## толькі прадлог для крывавай расправы над працоўнымі Зах. Беларусі

## Працоўныя БССР павінны ўзьняць рашучы голас пратэсту супроць наглай правакацыі фашысцкіх акупантаў

### Адозва Цэнтральнага Камітэту МОПР'у БССР да ўсіх працоўных, да ўсіх членаў МОПР'у Савецкай Беларусі

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Хістаецца глеба пад нагамі фашысцкай белапанскай акупацыі. У Зах. Беларусі яшчэ больш, чым ва ўсёй Польшчы, польскі фашызм сядзіць на вулкане. Першамайскія выступленьні рабочых і сялян паказалі магутны рост базавых настрояў мільёнаў рабочых і сялян, іх рашучай гатоўнасьці пад сьцягам камуністычнай партыі Польшчы, Зах. Беларусі выступіць у апошні рашучы бой за ўладу, за зьвяржэньне фашысцкай дыктатуры, за свае сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне.

З мэтай задушэньня рэвалюцыйна-вызваленчага руху працоўных мас у Зах. Беларусі, польскі фашызм рыхтуе новую правакацыю. Ад сярэднявяковых мэтадаў зьверскага катаваньня палітзьняволеных — рабочых і сялян, польскі фашызм пераходзіць зноў да адкрытага масавага крывавага тэрору.

Польскі фашызм, арганізаваўшы правакацыйны бомбапы замах на ст. Падбродзьдзе (Віленскае ваяводзтва), зараз разгортвае шалёную правакацыйную кампанію супроць усяго рэвалюцыйнага руху працоўных Зах. Беларусі і іх правадыра—камуністычнай партыі. Фашысцкія газэты, па ўказаньні дэфэнзывы, высунулі правакацыйную версію аб тым, што нібы КПЗБ зьяўляецца «арганізатарам замаху». Крывавы тэрор узмацняецца са дня ў дзень. Карныя экспэдыцыі ўводзяцца ў сыстэму. Новымі правакацыямі, новым разгулам тэрору, расстрэламі і шыбеніцамі польскі фашызм адказвае на надыходзячую рэвалюцыю ў Польшчы.

Таварышы! Мы добра памятаем разбойніцкія зьдзекі і катаваньні ў ЛУЦКАЙ, КОБРЫНСКАЙ, ЛІДЗКАЙ ДЭФЭНЗЫВАХ. Працоўныя БССР ня раз пратэставалі супроць катаваньняў распаленым жалезам, уліваньнем вады праз нос, забіваньнем пад пазногці арыштаваных шпілек, каб прымусіць падпісаць правакацыйныя і складзеныя дэфэнзывай пратаколы допыту. Працоўныя масы БССР ведаюць аб дзесятках працэсаў, складзеных на падставе такіх пратаколаў, што падпісаны крывёй забітых і катаваныхахвяр фашызму.

Тое-ж самае адбываецца зараз і з арыштаванымі рабочымі і сялянамі ў Сьвянцянскім павеце. У Сьвянцянскім павеце арыштавана 100 чал. рабочых і сялян. Гэтым арыштаваным дэфэнзыва правакацыйна прад'явіла абвінавачаньне ва ўдзеле ў замаху на ст. Падбродзьдзе.

Таварышы! Арганізуючы ўсё новыя і новыя правакацыі, польскі фашызм хоча задушыць і разграміць рэвалюцыйны рух мас. Фашысцкі ўрад, падрыхтоўваючы вайну супроць СССР, ідзе на самыя жорсткія ўтончаныя мэтады белага тэрору.

ЦК МОПР'у БССР заклікае ўсіх працоўных, усіх членаў МОПР'у яшчэ больш разгарнуць кампанію пратэсту супроць гэтай новай разьюшанай правакацыі польскага фашызму.

ЦК МОПР'у БССР заклікае працоўныя масы Савецкай Беларусі выказаць сваю пралетарскую салідарнасьць з працоўнымі масамі Зах. Беларусі, каб разам з імі не дапусьціць да гэтай правакацыі масавага зьнішчэньня рэвалюцыянэраў, разгрому нацыянальна-вызваленчага руху. Працоўныя масы БССР павінны патрабаваць спыненьня гэтых правакацый, вызваленьня ўсіх арыштаваных па правакацыйнай справе ў Сьвянцянах. Працоўныя масы БССР павінны выступіць на абарону жыцьця арыштаваных па гэтай хлусьлівай правакацыйнай справе ў Падбродзьдзі.

Перад тварам рабочых і сялян усяго сьвету працоўныя масы Савецкай Беларусі заяўляюць, што ў Зах. Беларусі фашысцкія правакатары і акупанты арганізуюць карныя экспэдыцыі накшталт крывавых экспэдыцый мінулай восеньню ў Зах. Украіне.

На гэту новую правакацыю, працоўныя БССР адкажуць яшчэ большым уздымам энтузіязму на фронце будаўніцтва сацыялізму, пасьпяховага сканчэньня бальшавіцкай сяўбы, узмацненьня абароназдольнасьці савецкай краіны, паглыбленьня інтэрнацыянальнай пралетарскай салідарнасьці, масавым уступленьнем у МОПР і дапамогай барацьбітом рэвалюцыі.

Прэч правакацыі фашыстаў! Прэч карныя экспэдыцыі ў Зах. Беларусі!

Няхай жыве інтэрнацыянальная пралетарская салідарнасьць працоўных ва ўсім сьвеце!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ МОПР'у БССР.

## Фашысцкі друк збавіў тон

### Беспрацоўныя масамі просяцца ў СССР

ВАРШАВА, 21. Сёньнешнія газэты, у адпаведненьне ад учарайшага крыклівага-правакацыйнага характару сваіх паведамленьняў, або зусім нічога ня пішуць аб «падзеях у Львове», або абмяжоўваюцца зьмяшчэньнем афіцыяльнага паведамленьня ПАТ'а, якое больш ці менш адпавядае сапраўднасьці.

Учора і сёньня квартал, у якім знаходзіцца савецкае консульства ў Львове, паранейшаму ачэплен коннай і пешай паліцыяй. За ўчарашны і сёньнешні дзень у консульстве зноў перабывала вялікая колькасьць беспрацоўных, якія просяць накіраваць іх на работу. Учора, 20 мая, было да 250 чалавек. (ТАСС).

Бэрлінскі паліцэй-прэзыдэнт Гржэзінскі на падставе надзвычайнага закону забараніў на 2 тыдні орган працоўных жанчын «Кемпфэрын». (3 газэт).

# Бурліць рэвалюцыйная хваля ў Польшчы

## Забастоўкі, дэманстрацыі, крывавыя сутычкі з паліцыяй—штодзённае зьявішча

## Рабочыя масамі пакідаюць рады сацыял-прахвостаў

### ЦЫНІЧНАЯ ЗАЯВА ПРАДСТАЎНІКА УЛАДЫ РАБОЧЫМ

ВАРШАВА, 21. Сёньнешнія газэты перапоўнены паведамленьнямі аб бязупынной **хвалі забастовак, дэманстрацый рабочых і беспрацоўных, новых скарачэньняў зарплаты і звальненьняў рабочых з прадпрыемстваў.** За адсутнасьцю заказаў і вялізарных запасаў вугалю на складах, кіраўніцтвы раду капалень Верхняй Сілезіі абвясьцілі аб звальненьні ў бліжэйшыя дні **3-х тыс. гарнякоў.** Буйнейшы мэталургічны завод **«Лаўра»,** на якім працуе **1.200 рабочых, закрываецца.** Закрываюцца буйнейшыя запалкавая фабрыка **«Пломык»** і **гумавая фабрыка на Памор'і.**

Падрабязнасьці падзей у Явожна, дзе паліцыя расстраляла дэманстрантаў рабочых і дзе забіта не 4, а **7 чал. і паранена 15,** выклікалі выключна-рэзкае абурэньне сярод рабочых. У капальнях Дамброўскага басэйну масавыя сходы рабочых прымаюць патрабаваньні ўсеагульнай забастоўкі. У Явожна на 3-х-тысячным мітынгу рабочых і іх сямей прадстаўнік улады заявіў, што **ўмовы працы і аплаты ў Явожна ня будуць зьменены.** Забастоўка ў Явожна працягваецца. Аўтамабіль, у якім ехаў дырэктар фабрыкі Радаош, **быў абстрэлян рабочымі.** У **Пражках** 19 мая сабралася 700 беспрацоўных с.-г. рабочых, патрабаваўшых прадастаўленьня работы. Зроблены шматлікія арышты.

У прымежных з Нямеччынай раёнах учора здылося некалькі дэманстрацый с.-г. рабочых і батракоў у сувязі са скарачэньнем попыту на рабсілу з боку Нямеччыны, куды штогод накіроўвалася некалькі дзесяткаў тыс. рабочых з Польшчы. Рабочыя, якія аказаліся ў бязвыходным становішчы, сабраліся ў ліку **звыш 2.500 чал. на мяжы Нямеччыны і нападзілі рад бурных дэманстрацый.** Дэманстрацыі былі разагнаны паліцыяй.

ППС-аўцы вымушаны прызнаць, што **кіраўніцтва рабочым рухам высьлізгае з іх рук і пераходзіць у рукі левых рэвалюцыйных элементаў.** «Ілюстраваны «Кур'ер Цодзенны» канстатуе, што «камуністычныя агітатары ўмела аўладаюць рабочымі арганізацыямі». (ТАСС).

## Эканамічны пакт аб ненападзе

### прывёў у моцнае замяшаньне імпэрыялістаў

ЖЭНЭВА, 21. Падкамісія эўрапэйскай камісіі на пасяджэньні прышла **ў моцнае замяшаньне, калі дайшла справа да абмеркаваньня прапанаванага тав. Літвінавым эканамічнага пакту аб ненападзе.** Усе дэлегаты сталі выказваць сумненьні ў магчымасьці прыняцьця пратаколу, які прапануецца савецкай дэлегацыяй. Дэлегаты, спасылаючыся пры гэтым на тое, што гэты пратакол зьявіўся для камісіі поўнай нечаканасьцю, ня вывучан урадамі і г. д. Уносіліся прапановы аб перадачы праекту на папярэднее абгаварэньне розных падкамісій, або органаў Лігі Нацый. Зазначалася таксама на пажаданасьць адкласьці пытаньне да наступнай сэсіі эўрапэйскай камісіі, якая склікаецца 3-га верасьня.

Перадаюць, што падкамісія **свабодна ўздыхнула,** калі тав. Літвінаў заявіў, што ён не дамагаецца безадкладнага абгаварэньня эканамічнага пакту аб ненападзе і не патрабуе, каб падкамісія рэкамандавала камісіі яго прыняць, і што ён лічыць за лепшае зноў падняць пытаньне аб пакце на наступнай сэсіі эўрапэйскай камісіі.

### Закрыцьцё сэсіі эўрапэйскай камісіі

ЖЭНЭВА, 22. Сёньня закрылася сэсія эўрапэйскай камісіі. На заключным пасяджэньні выступаў **тав. Літвінаў.** Тэвфік Рушдзі-бэй заяўляе, што **турэцкая дэлегацыя падтрымівае савецкі праект.** Курцыус і Заўнус (Літва) прапануюць паставіць пытаньне аб савецкім праекце на наступнай сэсіі эўрапэйскай камісіі.

**Гендэрсон** прапануе перадаць праект у каардынацыйную падкамісію.

Выступаўшы з заключнай прамоваю **Брыян** цьвердзіў, што праект будзе перададаны ў каардынацыйную камісію і пастаўлен на парадак дня бліжэйшай сэсіі эўрапэйскай камісіі, якая назначаецца **на 3-га верасьня.**

## З голымі шаблямі на дэманстрантаў

ВАРШАВА, 21. Сёньня ўвечары ў цэнтры Варшавы адбылася дэманстрацыя рабочых пад ярка выяўленымі камуністычнымі лёзунгамі. Зьявіўся транспарант з надпісам: **«Патрабуем вызваленьня палітычных зьняволеных,** далоў дыктатуру фашызму! Няхай жыве савецкая Польшча!» і г. д. **Конная паліцыя з голымі шаблямі атакавала дэманстрантаў,** зьбіваючы рабочых. Рабочыя некалькі раз рабілі спробу працягваць дэманстрацыю, якая кожны раз разганялася ўзброенымі паліцэйскімі. (ТАСС).

## Фабрыкі закрываюцца без канца

ВАРШАВА. Як паведамляе фашысцкі друк, масавае закрыцьцё фабрык працягваецца. З прычыны цяжкага фінансавага становішча на неакрэсьлены час закрыта ў Грудзёндзу фабрыка **«Герфэль і Вікторыус». Звольнена 500 рабочых.**

На днях мае быць закрыта запалкавая фабрыка **«Плочык».** У выніку—**350 рабочых** будуць выкінуты на вуліцу.

## Сялянства адмаўляецца плаціць падаткі

ВІЛЬНЯ. Рэвалюцыйная барацьба працоўнага сялянства супроць фашысцкай дыктатуры набывае усё больш і больш размах. Даведзеныя да роспачы сяляне масава выступаюць супроць зборчыцкай падаткаў, ня гледзячы на тое, што **расстрэлы сялянства паліцэйшчынай сталі штодзённым зьявішчам.**

У мястэчку **Глыбокім** (Віленшчына) сялянства, ня здолеўшы зьнесьці падатковага цяжару, **спаліла памяшканьне «скарбовай ізбы» з усімі падатковымі дакумантамі.**

## Пахаваньне ахвяр расстрэлу ў Марме абярнулася ў грандыёзную пралетарскую дэманстрацыю

СТАКГОЛЬМ, 21. Арганізаванае МОПР'ам пахаваньне забітых рабочых у Марме вылілася **ў вялікую пралетарскую дэманстрацыю.** На пахаваньні прысутнічала звыш **30.000 чал.,** у тым ліку дэлегаты рабочых арганізацый Швэцыі.

**Паліцыя арыштавала сёньня членаў ЦК швэдзкай кампартыі—Ліндэрута і Энкронца.** (ТАСС)

## Крывавыя падзеі ў Амэрыцы

### Жорсткія баі паміж бастуючымі рабочымі і войскам у Харлане

**НЬЮ-ЁРК, 21.** Орган кампартыі **«Дэйлі Уоркер»** публікуе карэспандэнцыю з **Харлана** (Кентукі), у якой паведамляецца, што ў апошнія тыдні, у часе сутычкі паміж **гарнякамі і паліцыяй забіта 16 гарнякоў і 13 паліцэйскіх.**

Як падае карэспандэнцыя, у раёне адбываецца **сапраўдная грамадзянская вайна.** Забастоўка гарнякоў пашырэцца. Рабочыя, **узброеныя 6 кулямётамі,** захопленымі ў складзе зброі прадпрыемству, аказваюць рашучае супраціўленьне войску і паліцыі, падпальваюць хаты, якія належаць кампаніі і г. д.

19 мая гарняні **адкрылі агонь па войскам.** У раёне Харлана працоўнае насельніцтва знаходзіцца ў надзвычай цяжкім становішчы, у сувязі з вялікім беспрацоўем і зьніжэньнем зарплаты.

## Французкія ўзбройваецца да зубоў

ПАРЫЖ. На вэрфях Лёрыяна скончана пабудова **новага контр-мінаносца «Жофр»,** вадазьмяшчэньнем **2.400 тон.** Новы контр-мінаносец прадстаўляе сабой самае быстраходнае судно ў сьвеце. Ён мае **5 гармат** калібрам у 138 міліметраў, адну гармату у 75 мм. і 4 у 39 мм., а таксама **6 мінных апаратаў.** Новы контр-мінаносец робіць 79 кілёметраў у гадзіну.

## Бэльгійскі камдэпутат выкрывае падрыхтоўку новай вайны

ПАРЫЖ, 16. Згодна паведамленьняў з Брусэля, пры абгаварэньні ваенных крэдытаў у бэльгійскім парляманце з вялікай выкрываўчай прамовай выступіў камдэпутат тав. **Жакмот

# БАЛЬШАВІЦКІМ КІРАЎНІЦТВАМ

## Месячнік друку

### выклікаў новы ўздым творчага энтузіязму

### *На Гомельшчыне арганізуюцца дзесяткі ўдарных рабкораўскіх брыгад*

### Новых 8 ударна-рабкораўскіх брыгад

У ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Шырока разгарнулася падрыхтоўчая работа да ўсебеларускага зьезду рабселькораў на Гомельскім ЧЫГУНАЧНЫМ ВУЗЬЛЕ. На сходах абгаворваецца ліст менскіх ударнікаў друку. Рабочым мясцкому № 6, абгаварыўшы гэты ліст, пастанавілі АДЛІЧЫЦЬ 1 ПРОЦ. У ФОНД НІЗАВОГА ДРУКУ. Работнікі цэнтральнай тэлефонай і тэлеграфнай станцый вынесьлі пастанову пачаць збор сродкаў на гэту-ж мэту праз падпісны ліст. Там-жа арганізавана адна рабкораўская ўдарная брыгада. У майстэрнях службы шляху рабочыя арганізавалі 8 РАБКОРАЎСКІХ УДАРНЫХ БРЫГАД і пастанавілі адпрацаваць 5 ГАДЗІН У ФОНД ДАПАМОГІ НІЗАВОМУ ДРУКУ. Усе мясцкомы рыхтуюць рапарты да вузлавога сходу рабкораў.

Брыгада «Зьвязды»:
Л. Сасімовіч, Ф. Козік, Яновіч.

### Арганізаваць газэты там, дзе іх яшчэ няма

#### 1-га чэрвеня адкрыецца агульна-гарадзкая выстаўка фабрычна-заводзкіх газэт

Прэзыдыум Менгарпрафсавету ў сваёй пастанове аб правядзеньні месячніка друку паказаў нізавым фабрычна-заводзкім арганізацыям на необходнасьць цеснага ўвязаньня месячніка друку з гаспадарча-палітычнымі кампаніямі, якія зараз праводзяцца: МЕСЯЧНІКАМ ПРАВЕРКІ САЦСПАБОРНІЦТВА, ПЕРАБУДОВЫ ПРАФРАБОТЫ, КУЛЬТЭСТАФЭТЫ і інш.

На ўсіх прадпрыемствах і па буйных цэхах, дзе яшчэ не арганізаваны газэты, трэба ДАБІЦЦА, КАБ У ЧАСЕ МЕСЯЧНІКА ЯНЫ БЫЛІ АРГАНІЗАВАНЫ. Забясьпечыць сыстэматычнае зьмяшчэньне матар'ялаў у газэтах на мовах нацменшасьцей, якія абслугоўваюцца данай газэтай.

У мэтах вылучэньня лепшага вопыту работы фабрычна-заводзкіх газэт ва ўсіх клюбах прапанавана арганізаваць з 25 па 31 мая выстаўкі іх, а з 1 ПА 5 ЧЭРВЕНЯ—АГУЛЬНА-ГАРАДЗКУЮ ВЫСТАЎКУ ў садзе «Прафінтэрн». ЛЕПШЫЯ ГАЗЭТЫ БУДУЦЬ ПРЭМІЯВАНЫ.

10 ліпеня вызначана правесьці масавую ПРАВЕРКУ РАБОТЫ ЎСІХ ПРАФСАЮЗНЫХ БІБЛІЯТЭК, дабіваючыся пры гэтым ачысткі іх ад шкодная літаратуры і павялічэньня ліку беларускай пралетарскай літаратуры і літаратуры нацменшасьцей. ФЗМК і рэдкалегіям прапанавана праверыць і дапамагчы рабоце насьценгазэт ПАДШЭФНЫХ КАЛГАСАЎ, САЎГАСАЎ І ВЕСАК. У выніку праверкі і дапамогі трэба дабіцца пасьпяховага сканчэньня веснавой сяўбы і калектывізацыі, лепшай арганізацыі працы і г. д.

Гарпрафсавет зьвярнуў увагу прафарганізацый на необходнасьць УЗМАЦНЕНЬНЯ РАСПАЎСЮДЖАНЬНЯ БЕЛАРУСКАГА ДРУКУ І ДРУКУ НАЦМЕНШАСЬЦЯЙ. У клюбах, садох, навучальных установах, на прадпрыемствах, дзе працуе больш 200 чал., павінны быць арганізаваны кіёскі друку.

Пры клюбах, садох і на буйных прадпрыемствах і ўстановах необходна арганізаваць ЛІТАРАТУРНЫЯ ГУРТКІ.

У першай дэкадзе чэрвеня будзе праведзен ЗЬЛЁТ РАБКОРАЎ, прысьвечаны ўсебеларускаму зьезду.

### На вечары друку

21 мая ў петнім тэатры саду «Прафінтэрн» адбыўся ТЭАТРАЛІЗАВАНЫ МІТЫНГ, прысьвечаны месячніку пралетарскага друку.

З вялікай прамовай аб росьце і задачах пралетарскага друку БССР выступіў загадчык сэктару друку Культпропу ЦК КП(б)Б тав. КУРЦІК.

Новая форма правядзеньня мітынгу сябе цалкам апраўдала. Унесеныя тэатралізаваныя моманты фактычна дапаўнялі ў мастацкай форме зьмест прамовы, рабілі яе яшчэ больш пераканаўчай.

Асабліва ўдалы момант жывой дэманстрацыі росту беларускага друку. Тут сапраўды перад кожным глядачом праходзіў малюнак павышэньня ліку газэт і часопісяў.

Няправільнае ўражаньне атрымалася ад дакараванай прывітальнай пераклічкі замежных камуністычных газэт. Знач на пепш было-б пераклічку рабіць з розных кутноў залі і без всьвятленьня месца выступленьняў.

Агульнае ўражаньне ад тэатральнага мітынгу надзвычай добрае. Пачынаньне каштоўнае. Трэба яго пашырыць.

### Арганізуем газэту-школу „пры Зьвязьдзе"

Шпаркі рост новых газэт у БССР, задачы далейшага паляпшэньня іх якасьці і павышэньня ролі друку ў разгорнутым сацыялістычным наступленьні патрабуюць усё новых і новых бальшавіцкіх кадраў. Паводле прыблізных падлікаў, да канца 1931 году толькі для адных раённых газэт патрэбна будзе ня менш 300 чал.

Ужо на сёньняшні дзень адчуваецца вялікі недахват газэтных работнікаў у існуючых газэтах. Досіць паказаць на тое, што пераважная большасьць цэнтральных, гарадзкіх і раённых газэт поўнасьцю не ўкамплектавана штатам. Калі мы гаворым аб камплектаваньні газэтнымі кадрамі, трэба выходзіць з установак, данай ЦК УсеКП(б) аб тым, што ад усяго складу рэдакцыйных работнікаў патрабуецца **«сапраўды бальшавіцкая вытрыманасьць і арганізатарскія здольнасьці, уменьне па-баявому і необходнымі тэмпамі арганізаваць масы на вырашэньне асноўных задач сацыялістычнага будаўніцтва».** Паводле пастановы ЦК КП(б)Б, прыняты рашучыя крокі па падрыхтоўцы газэтных кадраў: пашыраецца газэтнае аддзяленьне Камвузу да 175 чалавек, адкрываюцца газэтныя аддзяленьні пры Гомельскай сав. партшколе, Магілеўскім політасьветтэхнікуме і літаратурным факультэце дзяржаўнага ўнівэрсытэту. Павінны быць адкрыты газэтныя аддзяленьні пры менскім і віцебскім вячэрніх Камвузах. Але трэба памятаць, што **з гэтых крыніц мы атрымаем кадры толькі праз 2-3 гады.** Трэба прыняць усе меры, каб забясьпечыць кадрамі новаарганізаваныя газэты ўжо ў бягучым годзе. І зусім правільна менскія ўдарнікі друку ў сваім лісьце зьвяртаюць увагу на необходнасьць безадкладна адшукаць і ўжыць дадатковыя формы і мэтады падрыхтоўкі кадраў. ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове аб кадрах газэтных работнікаў паказаў, што **«адзнай з асноўных крыніц фармаваньня кадраў газэтных работнікаў павінны быць рабкоры і селькоры-ударнікі»** і прапанаваў рэдактарам центральных, рэспубліканскіх, краёвых і абласных газэт **«шырока разгарнуць выхаваньне гэтых кадраў шляхам арганізацыі кароткатэрміновых курсаў, гурткоў і г. д.».**

У адказ на заклік менскіх ударнікаў друку рад центральных гарадзкіх і раённых газэт узялі на сябе канкрэтныя самаабавязацельства па падрыхтоўцы кадраў. Рэдакцыя «Зьвязды» ўзяла на сябе абавязак арганізаваць газэту-школу. Маркуецца праз гэту школу па працягу кожных двух месяцаў падрыхтоўваць каля 20 чалавек кіруючых работнікаў раённых і фабзаводзкіх газэт. Выходзячы з таго, што асноўнае ў выхаваўчай рабоце рабселькораў заключаецца ў тым, **«каб рабочыя і сельскія карэспандэнты навучаліся ў ходзе сваёй работы, выпрацоўвалі ў сябе тую чуласьць журналіста-грамадчыка, без якой карэспандэнт ня можа выконваць сваёй місіі і якая ня можа быць прышчэплена якімі-небудзь штучнымі мерамі навучаньня ў тэхнічным сэнсе гэтага слова»** (Сталін), заняткі ў школе будуць пабудаваны выходзячы з самай цеснай увязкі тэарытычнай і практычнай падрыхтоўкі. У галіне тэорыі галоўная ўвага курсантаў школы будзе зьвернута на папраўленьне і прапрацоўку матар'ялу Леніна і Сталіна і партыйных пастаноў аб друку, на задачы і месцы друку ў разгорнутым сацыялістычным наступленьні на ўсім фронце, на вывучэньне вопыту «Правды» асабліва па пытаньні разгортваньня ўдарніцтва ў друку. Практычная работа курсантаў будзе ажыцьцяўляцца непасрэдна ў сэктарох рэдакцыі «Зьвязды» і ў адным з раённых газэт (маркуецца газэта «Ударнік Койданаўшчыны»). Практычная работа на тэй ці іншай галіне будзе праводзіцца пасьля тэарытычнай «падкоўкі» па гэтым пытаньні і такім чынам, будуць правярацца і напаўняцца атрыманыя веды. Вядомна, трэба ведаць наперад, што за двухмесячны тэрмін курсант атрымае толькі неабходны мінімум тэарытычных і практычных ведаў, патрэбных газэтнаму работніку, што газэтна-школа ня вычарпае тэй глыбокай палітычнай «падкоўкі», якая патрэбна пралетарскаму журналісту. Але вялікае значэньне нават тэй невялікай падрыхтоўкі, якую атрымае газэтны работнік у «Зьвязьдзе», відавочна. Такім чынам, мы зможам пры рэгулярнай рабоце падрыхтаваць у год 120 чалавек газэтных работнікаў.

Зараз рэдакцыяй распрацоўваецца дэтальная праграма работы школы і ў хуткім часе пачынаецца набор у яе. Кандыдатуры будучых курсантаў павінны будуць падбірацца і пасылацца непасрэдна рэдакцыямі адпаведных раённых і фабзаводзкіх газэт. Баявая задача падабраць для гэтага сапраўды лепшых рабселькораў-ударнікаў, якія адпавядаюць тым патрабаваньням, якія высоўнае партыя перад работнікам бальшавіцкага друку.

В.

## ЗАБЯСЬПЕЧЫМ ПЕРАБУДОВУ РАБОТЫ ПРАФСАЮЗНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

„Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарныя брыгады павінны стаць асновай усёй вытворчай дзейнасьці прафсаюзаў" (паст. XVI зьезду УсеКП(б)

### Кіраўніцтва прафработай—адказьнейшы вучастак

Пад непасрэдным кіраўніцтвам партыі нашы прафсаюзы дабіліся значных посьпехаў па перабудове сваёй работы адпаведна з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду. Прафарганізацыі ў асноўным павярнуліся тварам да вытворчасьці, шчыльна падыйшлі да ажыцьцяўленьня лёзунгу: «Пяцігодка—за чатыры гады». Пры непасрэдным дапамозе партыі прафсаюзы ачысьціліся ад апартуністычных кіраўніноў, разьвіваюць і замацоўваюць паварот да канкрэтнага вырашэньня палітычных і вытворчых задач у сваёй рабоце.

Трэці рашаючы год пяцігодкі, задача пабудовы фундаменту сацыялістычнай эканомікі СССР у бягучым годзе ўскладае на прафсаюзы яшчэ больш адказныя, яшчэ больш складаныя задачы... «Прафсаюзы павінны быць арганізатарамі змаганьня рабочых мас за выяўленьне максымальна-вытворчых магчымасьцяй на кожным вучастку, на кожным цэху і на кожным прадпрыемстве, за палапшэньне якасьці прадукцыі, за сацыялістычную рацыяналізацыю, за ўжываньне новай тэхнікі, што забясьпечвае далейшы рост прадукцыйнасьці працы, паляпшэньне ўмоў працы і вытворчасьці» (З рэст. V пленуму УсеЦСПС). Прафсаюзы стануць сапраўднымі арганізатарамі змаганьня рабочых мас за пяцігодку за чатыры гады толькі пры тэй умове, калі перабудуюць сваю работу так, як гэтага патрабуюць палітычныя і вытворчыя задачы трэцяга рашаючага году. V-ты пленум УсеЦСПС, які адбыўся ў пачатку бягучага году, намецілі канкрэтныя шляхі перабудовы работы саюзу, вызначылі канкрэтныя мерапрыемствы па рэарганізацыі, якая «ПАВІННА ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ САПРАЎДНАЕ ПЕРАНЯСЕНЬНЕ ЦЭНТРУ ЦЯЖАРУ ПРАФРАБОТЫ НА ПРАДПРЫЕМСТВА, ЗАВОД, САЎГАС, ЗЬМЕНУ І АСАБЛІВА ПЕРШАПАЧАТКОВУЮ ВЫТВОРЧУЮ ГРУПУ».

Прафсаюзная арганізацыя пераключылася на ажыцьцяўленьне пастаноў V-га пленуму і праводзіць зараз вялікую работу па рэарганізацыі, па перабудове сваёй работы. Аднак, асобныя прафарганізацыі ня толькі не пераключыліся на выкананьне пастаноў пленуму УсеЦСПС, а нават не распрацавалі гэтых пастаноў сярод шырокіх мас членаў прафсаюзу. Асабліва марудна перабудоўваюць сваю работу прафсаюзныя арганізацыі вясковых раёнаў. Калі на буйных прадпрыемствах асноўных нашых вытворчых цэнтраў, прафсаюзныя арганізацыі разгортваюць баявую работу па мабілізацыі мас вакол палітычна-вытворчых задач, дык у радзе раёнаў, на радзе параўнаўча невялікіх прадпрыемстваў гэта работа, або ў першапачатковым стане, а ў горшым выпадку—не пачыналася зусім.

Мы сёньня зьмяшчаем карэспандэнцыі двух раёнаў аб тым, што прафсаюзныя арганізацыі нават ня думаюць аб перабудове сваёй работы. Недапушчальны факт! Раённая кіраўніцтва ЛЕЗЬНЕНСКАЙ прафарганізацыі ня толькі не стаяць на чале разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, але нават ня ведае, колькі ў раёне ўдарнікаў і... лічыць, што спаборніцтва ў іх раёне сярод рабочых членаў прафсаюзаў разгортваць немагчыма.

Такое становішча магло скласьціся толькі таму, што ПАРТЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ НЕВЫСТАРЧАЛЬНА КІРАВАЛА РАБОТАЙ ПРАФСАЮЗАЎ, што кіраўнікі партыйнай арганізацыі недацэньваюць справы кіраўніцтва прафсаюзамі—гэтага важнейшага вучастку партработы.

Гэтыя факты вымушчаюць РЭЗКА ПАСТАВІЦЬ ПЫТАНЬНЕ АБ УЗМАЦНЕНЬНІ ПАРТЫЙНАГА КІРАЎНІЦТВА РАБОТАЙ ПРАФСАЮЗАЎ. Кожная парт'ячэйка, кожны парткалектыў павінны зараз-жа праверыць, наколькі фракцыі прафарганізацый забясьпечылі ў штодзённай рабоце ажыцьцяўленьне пастаноў V-га пленуму УсеЦСПС. Кожная раённая партарганізацыя павінна праверыць, як прафарганізацыі змагаюцца за выкананьне намечаных пляноў, наколькі прафсаюзы прымаюць актыўны ўдзел у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Партыйныя арганізацыі ні на хвіліну не павінны забываць, што кіраўніцтва прафработай — адказьнейшы вучастак партработы, што за гэты вучастак у першую чаргу нясуць адказнасьць партыйныя ячэйкі і калектывы.

### Аб лёзьненскіх апартуністах і іх... „чаше мудрости"

Перабудова работы Лёзьненскай прафарганізацыі праходзіла габінэтна, без удзелу шырокіх мас членаў саюзаў і таму не дала ніякіх канкрэтных рэзультатаў.

У часе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, калі прафарганізацыі другіх раёнаў разьвівалі канкрэтную дапамогу калгасам і сельсаветам у рабоце, прафарганізацыя Лёзьненскага раёну абмежавалася толькі тым, што выпрацавала плян удзелу ў пасеўнай кампаніі. **Ні адзін з пунктаў гэтага пляну ня выкананы.**

Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва на ільназаводзе, а таксама ва ўстановах не разгорнута. «У нас працуюць падзённа і таму якое можа быць ударніцтва»—так разважае старшыня райпрафсавету **Мікульеў.**

Усе важнейшыя палітычна-гаспадарчыя кампаніі праходзілі міма прафсаюзнай арганізацыі. Крытыка і самакрытыка не разгорнута. Наадварот, у радзе прафарганізацый былі факты грубага зацiску самакрытыкі. Кіруючыя прафорганы па іх рэагавалі фармальна.

Нельга абмінуць таго факту, што прафсаюз ня цікавіцца і ня кіруе насьценгазэтамі. Райпрафсавет нават ня ведае, колькі насьценгазэт выдаецца па прафарганізацыях. Гэта прывяло да ганебных фактаў. Мясцком саюзу мэдсанпрацы арганізаваў выхад газэты. Аб яе палітычным зьмесьце ня прыходзіцца і гаварыць, пакажам толькі, што яна завецца... «Чаша мудрости». Якое хаўмысное выпустошваньне палітычнага зьместу! Якое тупое пераўмыслае задач пізавога друку! Які ганебны факт апалітычнасьці, пад шырмай якое хаваюцца ідэалёгічна-варожыя і клясава-чужыя настроі. Праўда, загаловак «Чаша мудрости» быў зьнят, і зараз... газэта бяз назвы. Але факт застаецца фактам.

Прафарганізацыя не правяла адпаведнай работы ў напрамку ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі. З беларусізацыяй асабліва на чыгунцы, справа недапушчальна дрэнная.

Гэта ўсё—рэзультат недапушчальна-дрэннага парткіраўніцтва прафарганізацыяй. Мы лічым, што райком партыі павінен неадкладна паставіць пытаньне аб апартуністычным кіраўніцтве прафсавету, аб перабудове работы прафсаюзаў у адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду.

### Без парткіраўніцтва

Нашы прафсаюзы, у асноўным, зрабілі паварот тварам да вытворчасьці; аднак, асобныя зьвяньні яшчэ гэтага не дабіліся, не перабудавалі сваёй работы ў адпаведнасьці з пастановы V пленуму УсеЦСПС.

Прафарганізацыя Бульскага раёну, трэба проста сказаць, яшчэ ня толькі не перабудавала, а нават не зрабіла ў гэтым напрамку больш менш рашучых крокаў. Прычына заключаецца ў тым, што партарганізацыя невыстарчальна кіруе гэтай перабудовай, невыстарчальна займаецца пытаньнямі прафработы. Пачынаючы з райкому КП(б)Б і канчаючы парт'ячэйкамі арганізацыя не аддавала належнай увагі кіраўніцтву работай саюзаў. Іменна ў сувязі з гэтым у раёне ёсьць рад правалаў. Адным з найбольшых правалаў у вытворчай і выхаваўчай рабоце меў месца на торфазаводзе.

Прафарганізацыя раёну ня ўжыла рашучых крокаў да выкананьня пастановы V пленуму УсеЦСПС аб разбуйненьні саюзаў. Толькі па саюзу саўгандальслужачых праведзена сякая-такая работа. Па саюзе-ж працземлес ня толькі не праведзена работа па ажыцьцяўленьні пастаноў пленуму, а нават не распрацаваны гэтыя пастановы на сходах членаў саюзу.

Такі важны ва ўмовах нашага раёну саюз, як гарнякоў, сваю работу не перабудаваў у адпаведнасьці з тымі палітычнымі і вытворчымі задачамі, якія пастаўлены перад ім партыяй. Наадварот гэты саюз дапусьціў рад ганебных зьявішч, аб якіх «Зьвязда» ўжо зьмяшчала матар'ялы.

Важнейшы вучастак — дарожнае будаўніцтва не заняў у рабоце партыйнай і прафсаюзнай арганізацыі таго месца, якое яму на праву належыць. Заслухоўвалася рад дакладаў кіраўнікоў, даваліся дырэктывы, выносіліся пастановы. Між тым, на дарожным будаўніцтве, дзе працуе шмат сэзонных рабочых, не разгорнута, як сьлед, палітычна-масавая работа, у рэзультаце чаго ёсьць прарывы ў выкананьні намечаных пляноў будаўніцтва. Райком яўна недацэньвае справы дарожнага будаўніцтва. Гэта недацэнка выявілася хоць-бы ў тым факце, што перад самым пачаткам будаўнічага сэзону сакратар ячэйкі дарожнай дыстанцыі, які адначасова там-жа быў і культурна-масавым працаўніком, зьнімаецца з работы і пасылаецца ў райрыканком. Падрыхтоўка да дарожнага будаўніцтва праведзена невыстарчальна.

Масавая работа прафсаюзаў пастаўлена дрэнна ня толькі на дарожным будаўніцтве, але і па ўсіх іншых вытворчых арганізацыях. Прамфінплян не прапрацован, вытворчыя камісіі не працуюць. Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва на ўзьнімаюцца на вышэйшую ступень. Было рад выпадкаў скажэньня ідэі спаборніцтва і ўдарніцтва, калі змаганьне за колькасныя паказальнікі не ўвязвалася, адрывалася ад задач барацьбы за якасьць прадукцыі. Работа сэктароў не наладжана. У яе ня ўцягнуты шырокія масы членаў саюзу. Не праводзіцца ніякай работы і з прафактывам. Рабочы камітэт прафсаюзаў адсутнічае. Райпрафсавет праваліў рад важнейшых палітычна-гаспадарчых кампаній. Напрыклад, ён уключыўся ў правядзеньне 10-дзеньніка праверкі падрыхтаванасьці да сплаву. Але гэта ўключэньне зьявілася чыста фармальным папяровым.

У чым прычына таго, што прафсаюзы раёну не павярнуліся тварам да вытворчасьці? **Падкрэсьліваем, прычына ў слабым парткіраўніцтве прафсаюзамі.**

Як раённы камітэт партыі, так і ўсе нізавыя партыйныя раёну павінны неадкладна пераключыцца на ўзмацненьне кіраўніцтва работай прафсаюзаў, павінны дапамагчы ім павярнуцца тварам да вытворчасьці, дапамагчы ім перабудаваць сваю работу.

А. Мінуцкі.

700.000—ні адзэй тоны менш!

## ПАПЯРЭДЗІЦЬ ВЯЛІЗАРНЫ прарыў у торфпрамысловасьці

### УСЕ 22 ЗАВОДЫ--НА ПОЎНЫ ХОД!

### Ударыць па самацёку і безадказнасьці

Пачатак сэзону па здабычы машынафармовачнага торфу меркаваўся з 5 мая. Прайшло 15 дзён, тэрмін даволі значны, а ў работу ўключыліся толькі 16 брыгад з 22-х. З 75 машын фарматорфазаводаў з 22-х. З 75 машын фарматорфазаводаў з 22-х. З 75 машын працуе ўсяго вачнага спосабу здабычы працуе ўсяго 47, з 152 брыгад — 83 (на 20 мая). Значная частка торфамашын працуе ў адну зьмену. Зусім адсутнічае гаранталога гідраторфу (працуе адна). З 20 машын па фрэзарнай здабычы торфу атрымана больш паловы, але яшчэ не ўстаноўлены і не працуюць.

У чым прычыны такога маруднага разгортваньня работ на большасьці торфазаводаў?

Першая і асноўная прычына — гэта адсутнасьць адказнасьці адміністрацыі торфазаводаў і ўсяго «трыкутніка» за даручаную ім работу. Работа ідзе пастарынцы. Таму ёсьць рад торфазаводаў, як «Граблёва», «Шлях сацыялізму», «Вялікі Мох», «Чырвоны Кастрычнік», «Калектыўная праца», «Чырвоная Беларусь», Чырвоны сьцяг» — дзе ўсё павінна быць гатова, торфамашыны на месцы, але дзе да гэтага часу работа поўнасьцю не разгорнута. Машыны працуюць у адну зьмену з-за адсутнасьці рабочай сілы, а назербавана на гэтых заводах, паводле зводак саміх торфазаводаў, столькі рабочых, колькі патрэбна.

Дзе-ж прычыны недахвату рабочай сілы? Вярбоўка рабочай сілы праводзілася таксама па-старынцы. Дагаворы заключаліся без рабочых. Ніякай мэсавай работы сярод навербаваных рабочых у часе вярбоўкі не праводзілася. Праф камітэты і парт'ячэйкі былі ў баку ад гэтай важнейшай палітычна-гаспадарчай кампаніі. Дырэктывы ЦП саюзу і Белторфу аб падрыхтоўцы рабочых кадраў, напрыклад, аб скліканьні 7-дзённых курсаў брыгадзіраў, аб арганізацыі масавых канфэрэнцый тарфяньнікаў на мясцох вярбоўкі і г. д. — ня выкананы. На торфазаводах «Калектыўная праца», «Міхановічы», «Шлях сацыялізму» адміністрацыі (дырэктары і нават тэхнарукі) па цэлых тыдзях разьяжджала на асабістых справах, пакідаючы завод без кіраўніцтва.

Сталы кваліфікаваны кадр (спэцыялісты, сьлесары, матарысты, дзесятнікі) не расстаўлены па мясцох; ніхто з іх ня ведае сваёй работы і адказнасьці. Не арганізаваны ў брыгадах трыкутнікі, не разгорнута культмасавая работа сярод торфянікаў. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва адкладваецца да поўнага разгортваньня сэзону. Вытворчыя пляны брыгад не даведзены да рабочых. Нормы выпрацоўкі брыгады ня ведаюць. З-за непрацаздольнасьці заводзкіх «трыкутнікаў» гэтых заводаў адсутнічае сталае кіраўніцтва брыгадамі. Ужо з пачатку сэзону ёсьць спробы папсаваньня машын — загрузка элеватараў карчамі (торфазавод «Міхановічы»).

Дырэктывы ЦК КП(б)В аб мабілізацыі 1.000 камсамольцаў для тарфяной прамысловасьці далей раёнаў не пайшлі. Ні адзін з раёнаў ня выканаў разьвёрстки. Два камсамольцы, якія прыпілі на торфазавод «Грабянёва», замест таго, каб узяцца за работу, зараз-жа патрабавалі ад адміністрацыі пасобных кватэр. Зусім няма пералому ў дапамозе тарфяной прамысловасьці з боку савецкіх, партыйных і прафсаюзных органаў.

Бяз рашучага пералому ў дапамозе торфазаводам, без узмацненьня апэрацыйнага кіраўніцтва з боку Белторфу, без узмацненьня кіраўніцтва з боку ЦК саюзу — выкананьне прамфінпляну ў 758.000 тон торфу будзе стаяць пад пагрозай.

Патрэбна неадкладнае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, лепшая расстаноўка сіл і ўстанаўленьне адказнасьці за работу. Трэба забясьпечыць лепшымі ўдарнікамі «трыкутнікі брыгад», разгарнуць культмасавую работу непасрэдна ля машыны, у сталоўцы, чырвоных кутках, бараках і г. д.

ЦК ЛКСМ павінен тэрмінова правесьці выкананьне дырэктыў аб мабілізацыі камсамольцаў рэчнымі арганізацыямі і забясьпечыць разгортваньне выхаваўчай работы сярод моладзі на торфазаводах. «Трыкутнікам» торфазаводаў трэба правесьці рашучую барацьбу за ачыстку рабочых брыгад ад чужога элемэнту, барацьбу з рвацкімі настроямі пасобных рабочых, паладзіць рабочае забясьпячэньне, ня спыняючы перад прыцягненьнем да судзе вай адказнасьці работнікаў каапэрацыі, вінаватых у зрыве рабочага забясьпячэньня, арганізаваць вытворчыя суды на торфазаводах, моцна ўдарыць па апартуністах, на самацёку і кепскай рабоце.

Горагляд

Чырвонаармейцы ў ленінскім кутку

### Мэханічная майстэрня—вузкае месца заводу „Грабянёва"

#### Як шаўковая фабрыка „дапамагае" свайму торфазаводу

На торфазаводзе «Грабянёва» пакуль што працуюць тры машыны замест 6, паводле пляну. У чым справа? Пачнем з галоўнага — мэханічных майстэрань. Да самага пачатку сэзону машыны не рамантаваліся, а калі была атрымана дырэктыва пачаць сэзон з 5 мая, толькі тады пачалі варушыцца. Ясна, што хуткі рамонт ня даў патрэбных вынікаў. Дзьве машыны, якія пушчаны 5 мая, увесь час ломяцца. Трэцюю машыну ледзь пусьцілі 10 мая. А наконт іншых машын, калі пытаеш мэханіка, ён спакойны тонам адказвае: «Пусьцім 25 мая, не раней».

Адну машыну малога гідраторфу можна было пусьціць яшчэ 5 мая, але падвяла шоўкавая фабрыка, якой далі заказ на выраб восяй і якая заказу ня выканала. Заказ быў дан месяца паўтара таму назад і толькі 11 мая новы дырэктар заводу, разам з прадстаўніком Белторфу, катэгарычна патрабавалі ад шоўкавай фабрыкі выкананьня заказу. Тады фабрыка зрабіла дзьве восі, замест 4.

Культмасавая работа толькі за апошні час пачала праводзіцца.

Г. К.

### Ініцыятыву Варашылаўцаў і газ. „Рабочего" на ўсе прадпрыемствы Менску

#### *Пастанова бюро Менгаркому КП(б)Б*

1) Бюро гаркому КП(б)В ухваляе ініцыятыву рабочых заводу імя Варашылава, якія арганізавалі ударную брыгаду на прыкладным вывучэньні беларускай мовы, і расцэньвае іх пачынаньне, як найбольш дзейную форму практычнага ажыцьцяўленьня пастаноў кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)В па нацыянальным пытаньні.

2) Бюро гаркому КП(б)В канстатуе, што пачынаньне варашылаўцаў падхолена шырокімі рабочымі масамі Менску, і прапануе ўсім парткалектывам, цэх'ячэйкам, фракцыям фабзаўмясцкомаў забясьпечыць поўнае падтрыманьне і кіраўніцтва масавым добраахвотным рухам рабочых за аўладаньне беларускай мовай, які (рух) пачаўся, і ўкараненьнем беларускай мовы ў работу і быце, забясьпечыць вывучэньні гісторыі і эканомікі Беларусі.

3) Бюро гаркому КП(б)В ухваляе арганізацыю разгортваньня гэтага руху газэтай «Рабочий», прапануе ёй і надалей падрабязна асьвятляць работу ударных брыгад на аўладаньні беларускай мовы і арганізаваць разам з гарпрафсаветам праверку выкананьня абавязацельстваў, узятых на сябе брыгадамі.

4) Лічыць неабходным, каб усе центральныя газэты ўключыліся ў арганізацыю разгортваньня масавага добраахвотнага руху на вывучэньні беларускай мовы.

5) Пастанову зьмяшчаецца ў парадку прымусовага асартымэнту, дадаткам да гарэлкі.

### ПЕРАБУДАВАЦЬ ТЫСТЭМУ КНІГАРАСПАЎСЮДЖАНЬНЯ

Ідзе непатрэбная канкурэнцыя паміж выдавецкімі і кнігагандлёвымі арганізацыямі, няма плянавасьці ў завозе і г. д. Мімаволі паўстае **пытаньне пра арганізацыю ў БССР адзінай кнігараспаўсюджвальнай арганізацыі.** Вопыт Кнігацэнтру ў РСФСР сябе цалкам апраўдаў. Гэты вопыт з дапасаваньнем да ўмоў БССР трэба неадкладна, не пазьней восені г. г., перанесьці і нам. Месячнік друку павінен, нарэшце, прымусіць партыйныя і камсамольскія ячэйкі заняцца, згодна пастановам ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)В, справай кнігараспаўсюджаньня. Мы з поўнай адказнасьцю заяўляем, што **гэта работа недацэньваецца і партыйная дырэктыва ня выконваецца.** Ні адзін РК, ні адзін ГК партыі і камсамолу ня ставіў па сваёй ініцыятыве даклады работнікаў кнігарань БДВ або кніжных каапэрацыйных крам. Ня дзіва таму, што распаўсюджаньне беларускай і нацменаўскай кніжкі ў такіх рабочых цэнтрах, як Віцебск, Гомель, Бабруйск, адстае нават параўнальна з такімі цэнтрамі, як Полацак ці Ворша. Тут вінавата непаварот'івасьць, няўменьне, а часамі і нежаданьне кнігарань БДВ (Гомель) працаваць па-бальшавіцку, па-баявому, а таксама слабая ўвага партыйных, прафесыянальных і камсамольскіх арганізацый да справы распаўсюджаньня беларускай пралетарскай літаратуры і кніжкі нацменшасьцей. Сыстэматычнае невыкананьне плянаў кнігараспаўсюджаньня па гэтых гарадох гаворыць яшчэ пра тое, што **справа беларусізацыі** (а ў ёй не апошняе месца займае кніжка) **у іх пастаўлена дрэнна** і што гэта ліпні раз пацьвярджае словы т. Гея на XIII зьезьдзе пра становішча беларусізацыі на Віцебшчыне.

### ВЫДАВЕЦКАЯ ДЗЕЙНАСЬЦЬ ПАТРАБУЕ РЭАГАНІЗАЦЫІ

Яшчэ адна праблема павінна ў часе месячніка друку прыцягнуць увагу пралетарскай грамадзкасьці, а іменна, справа **канцэнтрацыі выдавецкай дзейнасьці. Арганізацыя «ОГИЗ'а»** у РСФСР у складзе тыпізаваных выдавецтваў сябе цалкам апраўдала. У БССР пакуль што **выдавецкая дзейнасьць распылена.** Мы да апошняга часу мелі і зараз маем такое становішча, што кожная давецтва, кожная часопісь выдавалася сваім ведамствам. Усё гэта прыводзіла і прыводзіць да нямэтазгоднага выкарыстаньня выдавецкіх кадраў, непатрэбных выдаткаў, паралелізму. Мы думаем, што **выдавецкую дзейнасьць трэба рэарганізаваць** па тыпе РСФСР, а іменна, пры выдавецтве «Зьвязда» арганізаваць партыйнае выдавецтва па тыпе «Правда», а ўсе іншыя выдавецтвы, за выключэньнем Цэнтравыдату, і часопісы перадаць БДВ, стварыўшы там спэцыяльныя сэктары (акадэмічнае выдавецтва, сэктар пэрыёдыкі і інш.). Гэтага вымагае і слабасьць паліграфічнай базы, якая часамі пры такім становішчы, якое ёсьць зараз, выкарыстоўваецца нерацыянальна (друкарня БАН, СНК ).

### ВЯЛІКІЯ ДАСЯГНЕНЬНІ НАС АБАВЯЗВАЮЦЬ

У месячнік друку мы можам дэманстраваць вялізарнейшыя дасягненьні ў галіне кнігі, дасягненьні, якія перакананча паказваюць рэальнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі і моцна б'юць па вялікадзяржаўнікім контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызьме, дасягненьні, якія дэманструюць поўнасьць і непарушнасьць працоўных усіх нацыянальнасьцей пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і яе ЦК і якія так непакояць замежных і ўнутраных інтэрвэнтаў. Даволі таго, што **за 4 месяцы 1931 г. БДВ выдала 460 назваў у колькасьці 4,5 млн. экз. кніжак,** што складае прадукцыю ВДВ за ўвесь 1927-28 год. За 1931 г. мы павінны даць каля 20 млн. экзэмпляраў кніжак, ці—1 кніжкі на кожную душу насельніцтва БССР. Мы даганяем і шмат каго з капіталістычных краін ужо апярэдзілі. Гэта яшчэ больш вострa, яшчэ больш па-баявому ставіць задачу выкананьня рэдакцыйна-выдавецкіх пляноў. Месячнік друку павінен дапамагчы ліквідаваць гэты прарывы, якія ёсьць, каб поўнасьцю выкананць пляны да канца году.

АЛ. НЕКРАШЭВІЧ.

**АД РЭДАКЦЫІ: Пытаньне аб перабудове сыстэмы кнігараспаўсюджаньня і выдавецкай дзейнасьці зьмяшчаецца ў парадку абгаварэньня. Просьба да ўсіх працаўнікоў памянёных галін работы выказацца аб гэтым на старонках газэты.**

## У месячнік друку--ліквід

# „СПРАВУ ГОНАРУ, СЛАВЫ І ГЭРОЙСТВА“

## паказаў ударны калгас „Камбайн“, Слуцкага раёну

**Ён скончыў на 17 дзён раней тэрміну веснавую сяўбу і бліскуча перавыканаў пасеўны плян, на справе давёўшы вялізарныя магчымасьці зьдзельшчыны, сацспаборніцтва і ўдарніцтва**

**Калгас „Камбайн“ павышае ўсе свае нормы выпрацоўкі і пераключаецца на практычную дапамогу адстаючай арцелі“ 1-га мая“, паказваючы ўзор вялікай палітычнай сьвядомасьці і вышэйшых форм ударніцтва на палёх**

*Партыйныя, савецкія і грамадзкія арганізацыі—ваш абавязак неадкладна перанесьці практыку калгасу „Камбайн“ ва ўсе саўгасы, калгасы і вёскі*

## МТС не дасягнулі рашучага зруху

### ЗВОДКА

*аб ходзе сяўбы ў калгасах, якія абслугоўваюцца МТС па становішчы на 20 мая (у табліцы даецца: назва МТС, пасеўны плян у гэктарах, колькі пасеяна і процант выкананьня пляну)*

| Паўднёвыя раёны | | | |
|---|---|---|---|
| Менская | 5.622 | 1.401 | 24,9 |
| Койдапаўская | 13.615 | 5.233 | 38,4 |
| Капыльская | 3.452 | 1.625 | 29,8 |
| Заслаўская | 7.929 | 1.232 | 16,8 |
| Танежыцкая | 6.360 | 1.849 | 29,1 |
| Смалявіцкая | 8.060 | 2.395 | 29,7 |
| Слуцкая | 5.400 | 2.093 | 38,8 |
| Клімавіцкая | 11.201 | 2.240 | 20,0 |
| Цераха́ўская | 6.670 | 664 | 9,9 |
| Стара-Дарожская | 4.389 | 1.789 | 40,8 |
| Жыткавіцкая | 11.523 | 2.369 | 20,6 |
| Касьцюковіцкая | 10.780 | 1.806 | 16,7 |
| **Усяго** | **95.001** | **24.796** | **26,0** |

| Паўночныя раёны | | | |
|---|---|---|---|
| Ветрынская | 6.360 | 740 | 11,3 |
| Асьвейская | 5.217 | 112 | 2,1 |
| Дрысенская | 6.200 | 2.795 | 45,1 |
| Борквіцкая | 6.100 | 500 | 8,2 |
| Вушацкая | 9.154 | 805 | 8,8 |
| Лепельская | 8.247 | 1.051 | 12,7 |
| Сеньненская | 7.634 | 682 | 8,9 |
| Расонская | 6.100 | 1.500 | 24,6 |
| Лезьненская | 6.785 | 784 | 11,6 |
| Сіроцінская | 6.636 | 695 | 10,5 |
| Горацкая | 7.699 | 3.1444 | 40,8 |
| Амсьціслаўская | 9.639 | 1.523 | 15,8 |
| Шклоўская | 9.563 | 828 | 8,7 |
| Гарадоцкая | 5.590 | 549 | 9,8 |
| Дубровенская | 5.265 | 985 | 18,7 |
| **Усяго** | **106.189** | **15.693** | **15,0** |
| **Усяго па БССР** | **202.000** | **41.500** | **20,4** |

**4-ая пяцідзёўка сяўбы па калгасах, якія абслугоўваюцца МТС, дае толькі 20,4 проц. выкананьня агульнага пляну сяўбы.** Замест 202 тыс. гэкт., засеяна 41.500 гэкт.

**12 паўднёвых МТС,** якія, згодна ўрадавай дырэктывы, **павінны скончыць сяўбу да 25 мая, выканалі свае заданьні толькі на 26 проц.** Замест 19 тыс. гэкт. у кожную пяцідзёўку, засяваюць толькі па 6.200 гэкт.

**15 паўночных МТС,** якія павінны **скончыць сяўбу да 5 чэрвеня, выканалі свае заданьне на 15 проц.**

Замест 17 тыс. гэкт. у кожную пяцідзёўку, засяваюць толькі па 3263 гэкт.

8 паўднёвых МТС **НАПЕРАДЗЕ** ідуць: **Стара-Дарожская**--выканала заданьне на 40,8 проц., а з паўночных МТС—**Дрысенская**—выканала заданьне на 45 проц. і **Горацкая**—на 40,8 проц.

**ГАНЕБНА АДСТАЮЦЬ** з паўднёвых МТС **Церахаўская**—выканала плян толькі на 9,9 проц. і з паўночных—**Асьвейская**—выканала плян на 2,1 проц.

Паўночныя МТС яшчэ маюць тры пяцідзёўкі да сканчэньня тэрміну сяўбы. Пры напружаных ударных тэмпах яны могуць яшчэ выканаць заданьне ў тэрмін. Пагроза невыкананьня пляну ў тэрмін ствараецца па паўднёвых МТС, якія павінны па працягу 5 дзён выканаць больш паловы усяго пляну сяўбы.

Спасылкі на позьнюю вясну ня могуць быць прыняты ў сур'ёз, бо, выходзячы з гэтых акалічнасьцей, урад і вызначыў іншыя тэрміны, асобна для паўднёвых і асобна для паўночных МТС. **Але той факт, што паўночная Дрысенская МТС ідзе наперадзе ўсіх МТС сьведчыць аб тым, што справа ня ў вільготнасьці глебы і клімаце. Посьпехі залежаць выключна ад умелай арганізацыі працы МТС і дзейнай дапамогі з боку зацікаўленых іншых арганізацый.**

Іменна арганізацыя працы кульгае па шмат МТС.

Характэрныя факты. У Дубровенскай МТС вытворчыя пляны не ва ўсіх калгасах складзены. **20 штук 12-радных сэвярак прыбылі бяз восей і ня могуць быць скарыстаны.** Па гэтай і па іншых МТС дрэнна ўвязваецца скарыстаньне жывой цягавай сілы, і трактарнай. Няма маршрутаў для трактараў.

Трактары не даюць патрэбнай прадукцыйнасьці працы і нормы гаручага перавыдаткоўваюцца.

Па радзе МТС наглядаюцца злачынныя адносіны да трактараў з боку трактарыстаў і старэйшых рулявых, што выклікае сыстэматычныя прастоі. Асабліва трэба адзначыць і заклеймёць ганьбай паломку трактара старшым рулявым **расонскай МТС—Упасавым,** які дазволіў трактарысту пусьціць на трэцюю хуткасьць толькі што атрыманы з чыгункі новы трактар, папярэдня не праверыўшы і не агледзеўшы яго, што **вывяла трактар са строю** на ўсю пасеўную кампанію.

**Аграном Смалявіцкай МТС Барушка,** замест работы ў калгасе, на працягу трох дзён сядзіць дома.

**Яшчэ далёка ня ўсюды трактары працуюць 21 гадзіну ў суткі.**

Зьдзельшчына па раёнах МТС лічыцца ўведзенай ужо амаль на ўсе 100 проц. На справе гэта ня так. Мы ня прынялі належных мер, каб арганізаваць правільны вучот працы ў калгасах.

Партыйныя і прафэсыянальныя раённыя арганізацыі павінны абвясьціць рашучую барацьбу з усімі канкрэтнымі посьбітамі правааапартуністычнай практыкі, якія тармозяць выкананьне і перавыкананьне пляну МТС.

**У бліжэйшыя 1-2 пяцідзёўкі МТС паўднёвых раёнаў павінны даць стопроцантнае выкананьне пляну, а МТС паўночных раёнаў—павінны дабіцца рашучага пералому.**

Б.

# Наперад, ні кроку назад

**ЦК КП(б)Б і газэце „Зьвязда“**

*Рапарт ударнікаў-калясьнікаў с-г. арцелі „Камбайн“, Слуцкага раёну*

Азнаёміўшыся праз газэту «Правда» з бліскучымі посьпехамі, якіх дасягнулі калгасьнікі юрты **Троіцкай** ва ўдарным правядзеньні сяўбы пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, мы, ударнікі-калгасьнікі арцелі «Камбайн», скончыўшы сёньня, 20 мая, веснавую сяўбу, рапартуем аб нашых посьпехах і мэтадах працы, якія далі нам магчымасьць выйсьці пераможцамі ў барацьбе за другую бальшавіцкую сяўбу.

**Асноўнай зарукай нашага посьпеху было тое, што мы добра зразумелі і ацанілі вялізарнае значэньне зьдзельшчыны ў справе ўшчыльненьня тэмпаў сяўбы і ўзмацненьня тэмпаў калектывізацыі.**

**28 красавіка мы вышлі ў поле, ліквідаваўшы абязьлічку ў карыстаньні коньмі, інвэнтаром і ўсёй калгаснай маемасьцю, перайшоўшы на зьдзельшчыну,** аднеэпую ў працаднёх, **адразу наладзіўшы правільны ўлік зьдзельшчыны.**

**Нашы нормы выпрацоўкі ў асноўным перавышалі на 20-40 проц.** нормы іншых калгасаў Слуцкага раёну, на гледзячы на тое, што нашы глебавыя ўмовы значна больш цяжкія, чым у іншых калгасах.

Да пачатку сяўбы мы пакончылі з існаваўшым у нас фармальным спаборніцтвам, **разгарнуўшы на аснове зьдзельшчыны сапраўднае ўдарніцтва на палёх.** Тады пачалася гэраічная барацьба соцень калгасьнікаў за рашаючую бальшавіцкую вясну. Ахопленыя магутным уздымам творчага энтузіязму, папы калгасьнікі, у большасьці сваёй, паказалі сапраўды ударныя тэмпы работы.

Выходзячы з разьмераў яравога кліну (180 гэкт.), паяўнасьці цягавай сілы і прынятых норм выпрацоўкі, мы предугледжвалі сканчэньне сяўбы за 40 дзён. Аднак, ужо першыя дні ўдарнай работы калгасьнікаў на палёх паказалі на справе, што, ня гледзячы на вялікую напружанасьць пляну, **намечаныя тэмпы могуць быць яшчэ больш павышаны.** Плян не адпавядаў таму размаху, які быў узят калгасьнікамі, дзякуючы ўдарніцтву.

І сапраўды, сярод 115 бядняцка-серадняцкіх двароў, якія яднае наша арцель, **не знайшлося ніводнага чалавека, што не адгукнуўся-б на заклік партыі** аб мабілізацыі ўсіх сіл і патраеньні тэмпаў, каб сваячасова выканаць і перавыканаць плян другой калгаснай вясны. Нашым агульным адказам на гэты заклік партыі была інтэнсыўная самаадданная работа на палёх, калектыўная зацікаўленасьць да калгаснай гаспадаркі.

**Дзесяткі лепшых ударнікаў-калгасьнікаў здолелі паказаць усёй калгаснай масе, што ўдарная праца на калгасных палёх — ёсьць «СПРАВА ГОНАРУ, СЛАВЫ І ГЭРОЙСТВА» і заразіць яе сваім прыкладам.** Вось чаму мы **СЯЎБУ ЗАМЕСТ 40 ДЗЁН СКОНЧЫЛІ ЗА 23 ДНІ,** скараціўшы тэрмін сяўбы на 17 дзён, **цалкам выканаўшы плян па тэхнічных і кармовых культурах і перавыканаўшы агульны пасеўны плян на 12 гэкт.** Дырэктыва партыі і ўраду аб пашырэньні яравога кліну супроць мінулага году на 17 проц. перавыкананa. Усяго намі засеяна 192 гэкт.

Некалькі прыкладаў нашай барацьбы за бальшавіцкую сяўбу. У Слуцкім раёне ёсьць МТС, але мы не зьвярнуліся за трактарнай дапамогай, а праводзілі сяўбу сваімі ўласнымі сіламі, **каб даць магчымасьць МТС скарыстоўваць трактары там, дзе яны больш патрэбны,** у менш арганізаваных калгасах.

**МЫ ЎСЮДЫ ПЕРАВЫКОНВАЛІ НОРМЫ ВЫПРАЦОЎКІ. Замест 0,75 гэкт. параконным плугом узорвалі больш аднаго гэктара; замест 2,5 гэкт. высявалі па 3,3 гэкт.; замест 15 цнтн. гною калгасьнік разьбіваў 25-27 цэнтнэраў; замест 5 вазоў гною вывозілі (на адлегласьць у 5 клм.) 8-9 вазоў. Перавыкананы нормы выпрацоўкі па ўсіх відах работ.**

Вялізарная ўвага была намі аддана жывой цягавай сіле. Мы захавалі коняй працаздольнымі да вясны, мабілізавалі ўсе нашы кармовыя рэсурсы; рацыянальна іх выдаткоўваючы.

**Наша ўдарная работа на аснове зьдзельшчыны зьявілася лепшым агітатарам за калгас. Замест 26 гаспадарак у мінулым годзе, мы зараз налічваем ужо 115 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.** У вёсках, якія аб'яднаны ў арцель «Камбайн», засталося ўсяго 6 аднаасобных гаспадарак. **Калгас канчаткова і назаўсёды пахаваў старую, раздробленую вёску Кляпчаны.**

У сувязі з пасьпяховым сканчэньнем веснавой сяўбы ў нашай арцелі, **мы бярэм на грамадзкі буксір адзін з адстаючых калгасаў у нашым раёне — сельска-гаспадарчую арцель «1-га мая». Заўтра мы пасылаем туды буксірную брыгаду ў складзе 12 лепшых ударнікаў і 12 пар коняй для дапамогі калгасу «1-га мая» ў хутчэйшым выкананьні пасеўных пляноў.** Мы даручылі нашай буксірнай брыгадзе перавесьці ў калгас «1-га мая» нашу практыку зьдзельшчыны і арганізаваць правільны ўлік яе.

**МЫ БЯРЭМ НА СЯБЕ АБАВЯЗАК ПАСТАВІЦЬ КАЛГАС «1-ГА МАЯ» Ў РАДЫ ПЕРАДАВЫХ КАЛГАСАЎ СЛУЦКАГА РАЁНУ.**

У сувязі з тым, што ўстаноўленыя намі раней нормы выпрацоўкі, дзякуючы сацспаборніцтву і ўдарніцтву, засталіся далёка ззаду фактычных норм, якія мы далі на практыцы, **мы даручаем праўленьню адпаведна павысіць нормы выпрацоўкі на ўсе аб'екты работ.**

Улічваючы вялізарнае значэньне машыннай тэхнікі ў справе індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі, **мы падпісваемся на машынныя абавязацельствы на суму 1.123 руб.**

Запэўняем ЦК КП(б)Б і газэту «Зьвязда», што **бальшавіцкіх тэмпаў не здамо.** Мы будзем неаслабнымі тэмпамі рыхтавацца да ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі, праводзячы іх такімі-ж мэтадамі работы, як і веснавую сяўбы, **не адступаючы ні на крок назад ад таго, што намі заваёвана ў часе штурму другой бальшавіцкай вясны.**

Па даручэньні агульнага сходу:

ударнікі-калгасьнікі — **Козел** Васіль, **Маглыш** Пётра, **Пацыкайлік** Якім, **Сарагавец** Цімох, **Пацыкайлік** Кастусь, **Давідовіч** Сяргей, **Лясун** Зьмітрок, **Каролік** Хама, **Каролік** Алеся, **Давідовіч** Ліза, **Казел** Сяргей, **Сарагавец** Герман, **Міханюк.**

## ПЕРАМОЖЦЫ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ

### Калгас „Бальшавік“ скончыў сяўбу на 15 дзён раней тэрміну

СТАРОБІН. Калгас «БАЛЬШАВІК» 20 МАЯ — Н А 15 ДЗЁН РАНЕЙ ПЛЯНУ скончыў сяўбу. Гэта дасягнута дзякуючы энтузіязму калгасьнікаў, ажыцьцяўленьню пастаноў партыі і ўлады аб зьдзельшчыне, якая ўжывалася ў калгасе з першых-жа дзён выхаду ў поле.

На полі былі правільна расстаўлены брыгады і разьмеркован кожны калгасьнік.

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж брыгадамі і паасобнымі калгасьнікамі забясьпечылі датэрміновае сканчэньне сяўбы.

Бранілваныя фонды фуражу на час сяўбы былі поўнасьцю створаны. Інвэнтар загадзя і поўнасьцю адрамантаваны.

Калгас «БАЛЬШАВІК» сваёй ударнай работай паказаў, як трэба змагацца за сваячасовае выкананьне сяўбы.

Яравы клін калгасу — 68 гэкт. У сярэднім на кожную сям'ю прыпадае па 4 гэктары ў той час, як у аднаасобнікаў пры адноль кавай колькасьці зямлі, а то і менш, аднаасобнікі яшчэ ня скончылі сяўбы.

За час веснавой сяўбы ў калгасе «Бальшавік» НЯ БЫЛО НІ АДНАГО ПРАГУЛУ.

ЗАКОНЧЫЎШЫ СЯЎБУ, КАЛГАС ПРЫСТУПАЕ ДА БУДАЎНІЦТВА.

М.

### САЎГАС „СЛАБАДА“ СЯЎБУ СКОНЧЫЎ

МАЗЫР. (Па тэлеграфу).

Насеннаводчы саўгас «СЛАБАДА», Мазырскага раёну, 20 мая поўнасьцю скончыў сяўбу, засеяўшы 551 гэкт.

Сяўба сваячасова скончана, дзякуючы ўдарнай рабоце ўсяго рабочага калектыву, разгорнутаму сацспаборніцтва і ўдарніцтву.

СУСТРЭЧНЫЯ НОРМЫ ВЫПРАЦОЎКІ ПЕРАВЫКАНАНЫ НА 30 ПРОЦ ПРОЦ.

### „Беларускі гаспадар“ і калгас імя Молатава перавыканалі пасеўныя пляны

АЗАРЫЧЫ.

Калгас «Беларускі гаспадар» 17 мая скончыў сяўбу ярыны. **Пасеўны плян па тэхкультурах перавыкананы.** На пляне было намечана засеяць 4,75 гэкт. ільну, засеяна 5,25 гэкт.

Калгас — сьвінаводча - таварная ферма — пабудаваў сьвінарнік на 150 сьвіноматак. **У часе сяўбы ў калгас уступіла 12 бядняцка - серадняцкіх гаспадарак.**

Калгас імя Молатава **перавыканаў плян сяўбы.** Аўса на пляне было намечана 8 гэкт., а засеяна 18. Перавыкананае плян сяўбы калгас «Зорка Беларусі», было намечана на пляне засеяць 4 гэкт., а засеяна 6 гэктараў, па збожжавых культурах плян перавыкананы на 10 гэктараў.

Рыклін

### ЛЁЗЬНЕНСКІ ПОЛЬСКІ НАЦСАВЕТ ЗАВЯРШАЕ СУЦЭЛЬНУЮ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ

БАРЫСАЎ, 22. (Па тэлефону).

У Лёзьненскім польскім нацыянальным сельсавеце ўзмацніўся калгасны прыліў. **Апошнія два тыдні далі ў калгасы новых 84 гаспадаркі. Сельсавет калектывізован поўнасьцю за выключэньнем 8 гаспадарак.**

**У сельсавеце створан адзін вялікі калгас імя Домбаля.**

Калгас з посьпехам праводзіць веснавую сяўбу.

24-га ў сельсавеце рыхтуецца вялікае сьвята, прысьвечанае абмеркаваньню Лёзьненскага сельсавету сельсаветам суцэльнай калектывізацыі. З боку райвыканкому і шэфа — гуты імя Домбаля рыхтуюцца прэміі сельсавету за пасьпяховае завяршэньне суцэльнай калектывізацыі на сваёй тэрыторыі.

## Палітычна шкодная ўстаноўка

Асноўнай прычынай таго, што да пяперашняга моманту яшчэ далёка ня ўсе калгасы БССР перайшлі на зьдзельшчыну, бясспрэчна, зьяўляецца апартуністычная недаацэнка гэтага важнейшага палітычнага мерапрыемства з боку раду мясцовых арганізацый, асабліва райкалгассаюзу.

Сутнасьць зьдзельшчыны заключаецца ў тым, што хто больш працуе той больш атрымлівае. Большасьць калгасаў яшчэ гэтага не зразумела. Выразнасьці ў гэтым ударным пытаньні на мясцох яшчэ няма.

Вынікі абсьледваньня паасобных калгасаў інспэктурай Калгасцэнтру паказваюць, што якасьць пераходу на зьдзельшчыну зусім невыстарчальная, што з прычыны адсутнасьці ўліку працы ў радзе калгасаў атрымліваецца «ўраўнілаўка», запісваюцца «палачкі», зьдзельшчына, такім чынам, існуе больш на паперы, чым на справе.

У практыцы некаторых калгасаў зараз наглядаюцца дзьве крайнасьці: або занадта павялічаныя або занадта зьніжаныя нормы. І тое і другое аднолькава шкодна, выкарыстоўваецца клясавым ворагам для агітацыі супроць зьдзельшчыны, для падрыву калгаснага руху. Кулакі і іх агенты імкнуцца давесьці калгасьнікам, што, ня гледзячы на больш напружаную працу, яны ўсёроўна атрымаюць аднолькава з гультаямі. Зусім зразумела, што скрыўленьні ў пытаньнях зьдзельшчыны перашкаджаюць разгортаньню сапраўднага сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Правільна бяручы стаўку на лепшы калгас, на лепшую брыгаду і яе выпрацоўку пры ўстаноўленьні норм,

**Калгасцэнтр аднак не дае выразнай устаноўкі, як устанаўляць нормы для работ, якія здыйсняюцца круглы год, асобна на зімовы і летні перыяд. Няма таксама выразнасьці ў ацэнцы колькасьці і якасьці працы ў асяродзьдзі брыгады.**

У кніжцы Калгасцэнтру з прыкладнымі нормамі для калгасаў у тым месцы, дзе гаворыцца аб моментах, якія могуць мець уплыў на нормы выпрацоўкі, адзначаецца, што **трэба ўлічваць «нацыянальнасьць, нацыянальныя асаблівасьці» работніка.** Калі ўважліва разабрацца ў гэтым тлумачэньні, дык атрымаецца, што ў калгасе для розных нацыянальнасьцей павінны быць устаноўлены розныя нормы выпрацоўкі—для беларусаў адна, для палякаў — другая, для яўрэяў — трэцяя. **Больш памылковай, папітычна шкоднай устаноўкі цяжка і прыдумаць. Яна зьяўляецца яўным скрыўленьнем нацыянальнай палітычнай партыі.**

Мы патрабуем ад Белкалгасцэнтру прыняцьця самых тэрміновых мер для яе выпраўленьня.

Мы патрабуем, каб Калгасцэнтр даў зусім выразныя ўстаноўкі па ўсіх пытаньнях арганізацыі працы на прынцыпах зьдзельшчыны, бо бяз гэтага правільна ўкараніць зьдзельшчыну, ацэненую ў працаднёх, для раду калгасаў будзе вельмі цяжка.

Б—кі.

## Аб палітычных памылках, дапушчаных у брашуры „Прыкладныя нормы выпрацоўкі ў калгасах“

У выданай Калгасцэнтрам брашуры «Прыкладныя нормы выпрацоўкі для калгасаў», апрача разгледжанай і зацьверджанай праўленьнем пастановы нарады па пытаньнях арганізацыі працы і норм выпрацоўкі, зьмешчана тлумачэньне норм выпрацоўкі, напісанае тав. Лодысевым, прагледжанае і зрэдагаванае кіраўніком сэктару арганізацыі працы тав. **Балціным.** Канстатаваць, што ў гэтым матар'яле—у тлумачэньнях дапушчана грубая палітычна-шкодная памылка. Яна заключаецца ў тым, што ў разьдз. **«Ад чаго залежыць велічыня норм выпрацоўкі»** (12 старонка) робіцца спасылка, як на адну з прычын, што робяць уплыў на велічыню норм выпрацоўкі, на «нацыянальнасьць і нацыянальныя асаблівасьці» і ставіцца ў залежнасьць ад гэтага велічыня норм выпрацоўкі, гэтым самым фактычна абараняецца кулацкая антысэміцкая, шавіністычная тэорыя.

Адзначаючы і канстатуючы гэта, як недапушчальную, шкодную палітычную памылку, дапушчаную Калгасцэнтрам у сваім афіцыяльным выданьні, праўленьне Калгасцэнтру пастанаўляе:

1) Прымаючы пад увагу, што аўтар тлумачэньня да норм (інструкцыі) тав. Лодысеў сыстэматычна дапускае памылкі ў пытаньнях арганізацыі працы, абаранае іх, а не выпраўляе сваіх памылак, **звольніць Лодысева з працы ў Калгасцэнтры** і лічыць нематчымым далейшае скарыстаньне яго на працы ў калгаснай сыстэме наогул.

Прасіць бюро ІТС і мясцком абгаварыць пытаньне ў прафсаюзным парадку.

2) **Тав. Балціну,** члену праўленьня Калгасцэнтру, кіраўніку сэктарам арганізацыі працы, якому быў даручан канчатковы прагляд тэксту брашуры, які дазволіў у афіцыяльны матар'ял, зацьверджаны праўленьнем, уключыць дадаткова інструкцыю, напісаную Лодысевым, пры прагледзе матар'ялу, карэктуры і рэдагаваньні пакінуў няправільную, палітычна - памылковую фармулёўку, нясур'ёзна і безадказна адносіўся да даручанай работы,—**абвясьціць вымову,** указаўшы яму на неабходнасьць самых сур'ёзных і ўважлівых адносін да даручанай работы.

3) Абавязаць **Балціна** даць тэрміновыя пісьмовыя тлумачэньні калгасам і калгасаюзам аб палітычнай шкоднасьці і няправільнасьці паказанай вышэй фармулёўкі ў брашуры.

Прапанаваць усім калгассаюзам выкінуць з брашуры інструкцыю, карыстаючыся выключна толькі пастановай нарады па пытаньнях арганізацыі працы і нормамі выпрацоўкі, якія зацьверджаны праўленьнем Калгасцэнтру.

4) Абавязаць сэктар працы выдаць да 1 ліпеня пераапрацаваную брашуру з удасканаленьнем норм выпрацоўкі на аснове існуючых матар'ялаў ужываньня норм у веснавую сяўбу.

Старшыня Калгасцэнтру БССР **МІЦЬКОЎ.**

Сакратар **П. МІРОНАЎ.**

## Арцель „Энгельс“ узяла на буксір адстаючых аднаасобнікаў

ПОЛАЦАК. (Наш кар.).

У калгасе імя **Энгельса** сяўба ў разгары. Дзякуючы дружнай рабоце і ўвядзеньню зьдзельшчыны, ацэненай у працаднёх, **калгасьніці даюць высокую прадукцыйнасьць працы.**

**Нормы выпрацоўкі перавыконваюцца.**

Пры норме забаранаваць **1,5 гэкт.** выконваюцца 2 гэктары, па ворыве норма прынята ў ½ гэкт., заворваецца ¾ гэкт.

Уся работа на полі праводзіцца на аснове ўдарніцтва і сацспаборніцтва паміж палявымі брыгадамі.

Калгас «Энгельс» узяў на грамадзкі буксір суседзяў аднаасобнікаў — беднякоў і сераднякоў у справе хутчэйшага і лепшага правядзеньня сяўбы.

**А. Шустры.**

## У глыбокім тыле

### У рэзалюцыях—зьдзельшчына, а на справе—падёншчына

**ДУБРОЎНА.** (Наш кар.).

Амаль па ўсім раёне праведзены сходы калгасаў, дзе прыняты рэзалюцыі аб пераходзе на зьдзельшчыну. **Але на справе ніхто не дапамог калгасам практычна перавесьці сваю работу на зьдзельшчыну.** Напрыклад, у калгасе **Карабановічы, Сваташыцкага** сельсавету, пры прыняцьці норм выпрацоўкі аграном, які праводзіў гэты сход, умудрыўся правесьці і зацьвердзіць поўнасьцю нават і тыя нормы, якія яўна не падыходзяць да мясцовых умоў. У выніку праўленьне калгасу ў лепшым выпадку толькі пасьля працы вызначае колькі працадзён запісаць у табэль, а ў большасьці **ўсім адпрацаваўшым рабочы дзень запісваецца па адным працадні, незалежна ад колькасьці, якасьці і кваліфікацыі працы.**

Рабочых пляну праўленьні калгасаў часта ня прытрымліваюцца, бо яны былі выпрацаваны бяз уделу праўленьняў. Каляндарных пляну сяўбы зусім няма. Значная частка рабочай сілы зусім не скарыстоўваецца або скарыстоўваецца няпоўнасьцю.

Форма табэля працы брыгад, якая разасланa райкалгассаюзам, такая блытаная, што «чорт нагу зламае».

Нарада упаўнаважаных, якая адбылася гэтымі днямі, паказала, што такое становішча ня толькі па Сваташыцкім сельсавеце, але і на ўсім раёне. Ня толькі сельсавецкі актыў, але і ўпаўнаважаныя раёну ў большасьці не ўсьвядомілі сутнасьці зьдзельшчыны і ня ведаюць, як яе практычна арганізаваць на месцы.

***

Дубровенская МТС да гэтага часу ўсё яшчэ не зьяўляецца арганізатарам і перадавіком перабудовы сельскай гаспадаркі. У лепшым выпадку работу МТС можна характарызаваць, як работу дрэннага пракатнага пункту.

Трактары раскідуты па ўсіх калгасах Старшы мэханік, які абслугоўвае 6-7 трактараў, ня можа іх сваячасова абслужыць. Наглядаюцца вельмі частыя прастоі трактараў.

**Саюспаборніцтва паміж трактарыстамі не праводзіцца.** Да гэтага часу сярод трактарыстаў не прапрацаваны нормы выпрацоўкі. Кіраўніцтва МТС, якое ня здолела арганізаваць працу ў самой МТС, нічога ня робіць для арганізацыі працы ў калгасах.

Неабходна дабіцца рашучага пералому ў рабоце МТС, рашуча ўдарыўшы па апартуністычнай практыцы раду работнікаў МТС.

**Ваўчок.**

### Мазалаўскі сельсавет павышае тэмпы

МСЬЦІСЛАЎЛЬ.

Ня гледзячы на слабасьць і невыстарчальнасьць цягавай сілы, калгасы **Мазалаўскага** сельсавету з посьпехам праводзяць веснавую пасеўную кампанію. На **17 мая** ўзарана больш за **50 проц.** яравога кліну. Зараз праводзіцца масавая сяўба ярыны. Пшаніцы пасеяна **91,5 проц.** пляннавага заданьня, ячменю — **26** проц., вікі — **30 проц.,** аўса — **3,5 проц.** Некаторыя яравыя ўжо ўзышлі, прычым усходы вельмі добрыя.

Індывідуальны сэктар адстае ад калгаснага — узарана ўсяго **30 проц.** яравога кліну, пасеяна **12 проц.** пляннавага заданьня.

У сувязі з тым, што зараз цягавая сіла значна падкормліваецца на полі, тэмпы ворыва і сяўбы павышаюцца.

Ячэйкай КП(б)Б і сельсаветам ужыты меры да засеву бросавай зямлі, які налічваецца каля **150** гэктараў. Насеньне на гэту зямлю ўжо ёсьць, калёны МТС праводзіць ворыва, а суседні калгасы засяваюць. Такім чынам, бросавая зямля ў сельсавеце будзе поўнасьцю засеяна.

М.

### Арганізацыя торфяной кампэрацыі

МАСКВА, 22. Цэнтрасаюз пастанавіў рэарганізаваць работу спажыўкаапэрацыі па абслугоўваньні рабочых тарфянікаў, у адпаведнасьці з адозвай СНК СССР, ЦК УсеКП(б) і Цэнтрасаюзу ад 12-га мая.

У буйных торфараспрацоўках арганізуюцца для абслугоўваньня пастаянных і сэзонных рабочых самастойныя рабочыя кампэратывы. Рабочыя торфараспрацовак, якія знаходзяцца пад ведамам прамысловых прадпрыемстваў, абслугоўваюцца кампэратывамі гэтых прадпрыемстваў. Дробныя торфараспрацоўкі, якія а-за аддаленасьці ня могуць быць ахоплены куставымі кампэратывамі, абслугоўваюцца мясцовымі кампэратывамі. Улічваючы асобныя ўмовы торфараспрацовак, Цэнтрасаюз прызнаў неабходным пакінуць грамадзкае харчаваньне, хлебапячэньне, агародны і жывёлагадоўчыя гаспадаркі пад ведамам торфяной кампэрацыі, не перадаючы іх аўтаномным галінавым аб'яднаньням і сэкцыям Цэнтрасаюзу.

Для сэзонных рабочых на торфараспрацоўках дапускаецца **падвойнае членства ў кампэрацыі—па месцы пастаяннага жыхарства і па месцы працы.** Вызначэньне і арганізацыя нізавой сеткі торфарабкопаў павінны быць закончаны не **пазьней 1-га чэрвеня.** Для агульнага кіраўніцтва работай торфарабкопаў пры спажыўсаюзах арганізуюцца аўтаномныя сэкцыі. Для арганізацыі гаспадарчага абслугоўваньня торфарабкопаў пры Цэнтрасаюзе арганізуецца аўтаномная сэкцыя тарфяных кампэратываў. Саюзторф і яго арганізацыі садзейнічаюць рабоце рабкораў, вызначаючы побач з Цэнтрасаюзам сродкі для ўзмацненьня матар'яльна-тэхнічнай базы, прадастаўляючы транспартныя сродкі, фінансуючы капітальнае будаўніцтва кампэратыўных гаспадарак.

**Абласным, краявым і рэспубліканскім спажыўсаюзам** запрапанавана вызначыць торфарабкопам гандлёвую сетку, абсталяваньне, транспарт, укамплектаваць апарат тарфяной кампэрацыі работнікамі, у першую чаргу, з ліку ранейшых працаваўшых на торфараспрацоўках.

У сувязі з гэтай пастановай Цэнтрасаюзу, ЦК саюзу торфасланцавых рабочых Саюзторф запрапанаваў сваім арганізацыям неадкладна аказаць дапамогу спажыўкаапэрацыі ў рабоце арганізацыі тарфяной кампэрацыі.

# ВЫШЭИ СЬЦЯГ УДАРНІЦТВА НА СПЛАВЕ!

## ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ЛЕСАЗАВОДЫ І ПАБУДОВЫ ЛЕСАМАТАР'ЯЛАМІ—АБАВЯЗАК КОЖНАГА ПЛЫТАГОНА І ЛЕСАРУБА

*Падвоіць тэмпы сплаву. Ударыць па ныціках і малаверах. Выгнаць з радоў плытагонаў агентаў клясавага ворага*

**Заклік бабруйскіх дрэваапрацоўшчыкаў давесьці да кожнай сплаўнай прыстані, да кожнага плытагона**

### Да ўсіх рабочых, служачых і тэхнэрсаналу сплаўных кантор і леспрамгасаў БССР

Рабочая кляса і працоўнае сялянства, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, дасягнулі нячуваных посьпехаў у будаўніцтве сацыялізму. У непрымірымай барацьбе з ухіламі ад ленінскай лініі, у жорсткай клясавай барацьбе мы з посьпехам ажыцьцяўляем лёзунг: «Пяцігодка—за чатыры гады», па многіх галінах прамысловасьці пяцігадовы плян выканан за 2 з паловай гады.

Мы ўступілі ў трэці рашаючы год пяцігодкі, год сканчэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі. На нас ускладаецца адказны абавязак—падвоіць нашы тэмпы, яшчэ мацней ударыць па ныціках, малаверах, па клясава-варожых элемэнтах.

**Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат** зьяўляецца буйнейшым прадпрыемствам, якое працуе на экспарт, а таксама дае лесаматар'ялы для новых пабудоў.

Камбінат з прарывам у выкананьні прамфінпляну скончыў 1929-30 год і асобны квартал, з прарывам уступіў у трэці рашаючы год. Гэтыя прарывы ставяць пад пагрозу ажыцьцяўленьне пляну будаўніцтва новых прадпрыемстваў. Апрача ўнутрызаводзкіх непаладак (безгаспадарчасьць, слабая рацыяналізацыя, прагулы), якім мы абвясьцілі самую рашучую, самую бязьлітасную барацьбу, адна з прычын нашых прарываў—**непадача сыр-цу для цэхаў камбінату.** З-за непадачы сырцу завод прастаяў у красавіку тры пяцідненькі. Кожны дзень прастою каштуе дзесяткі тысяч рублёў; кожны дзень прастою б'е па выкананьні экспартных плянаў, па ажыцьцяўленьні плянаў сацыялістычнай будоўлі.

Т. т. плытагоны, калгасьнікі, беднякі, серадняки, т. т. рабочыя леспрамгасу! Ці ведаеце вы, што непадачай сырцу вы тармозіце будаўніцтва «518» і «1.040»?

Мы, рабочыя і адміністрацыйна - тэхнічны пэрсанал Бабруйскага камбінату, пераключыліся на ліквідацыю прарываў. Мы абавязаліся вярнуць дзяржаве сваю запазычанасьць. **Але мы патрабуем гэтага-ж пераключэньня і ад вас. Мы вам прад'яўляем рахунак—поўнасьцю выканаць пляны вывазкі і сплаву лесу, і гэты рахунак вы павінны аплаціць.** Гэтага патрабуе рабочая кляса і працоўныя масы ўсяго Савецкага Саюзу.

Т. т. ударнікі сплаву і лесараспрацовак! У гэтым годзе бабруйскі камбінат павінен атрымаць 400.000 кбм. піламатар'ялаў. Праграма вялізарная, але зусім рэальная. Яна будзе выканана толькі тады, калі вы сапраўды ўявіце сабе ўсю адказнасьць вашай работы, па-бальшавіцку выканаеце ўзятыя на сябе абавязацельствы.

**Арганізуйце ўдарныя брыгады імя «518» і «1.040»! Абвясьцеце рашучую барацьбу апартуністычнай стаўцы на самацёк, моцна ўдарце па кулацкіх агентах, рвачох, прагульшчыках і лятунох.**

Цэхі камбінату павінны атрымаць сырэц. Але задача ня будзе поўнасьцю выканана, калі мы не павядзем упартай барацьбы за якасьць прадукцыі. Дагэтуль камбінат атрымліваў амаль не адсартаваны сырэц. З-за гэтага зьмяншаўся выхад піламатар'ялаў, павялічваўся сабекошт прадукцыі. Больш гэтага, былі выпадкі шкодніцтва з боку паасобных плытагонаў—агентаў кулацтва, — якія, з мэтай падарваць работу нашых прадпрыемстваў, сьвядома забівалі цьвікі ў калоды, што выклікала паломку піл.

Т. т. плытагоны, лесарубы і возчыкі! **Выганьце са сваіх радоў клясава-чужыя, кулацкія, шкодніцкія элемэнты. Прымеце рашучыя меры да паляпшэньня якасьці сплаву. Дайце сартаваны лес для цэхаў камбінату!**

Мы ўпэўнены, што ва ўпартай барацьбе з апартуністычным самацёкам, ілжэўдарніцтвам і шкодніцтвам плян сплаву будзе выканан.

Вышэй сьцяг ударніцтва і сацспаборніцтва на сплаве! Нахай жыве кіраўнік сацыялістычнага будаўніцтва—ленінская камуністычная партыя!

**Рабочыя і адм.-тэх. пэрсанал Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату.**



### Нёманскі леспрамгас зрывае зьніжэньне сабекошту сплаву

Нёманскі леспрамгас за 1931 год павінен сплавіць да канчатковага пункту — **Замосьце 100.000 кбм.** лесаматар'ялаў, з ліку якіх 50.000 кбм. павінна быць сплаўлена вясной. Улічваючы практыку мінулага году, каб стварыць умовы для хуткай і свайчасовай адгрузкі дастаўленага лесаматар'ялу, адміністрацыя прапанавала абавязкова рабіць сартаваньне ў часе падвозкі лесаматар'ялаў да прыстаняй. Лесаматар'ялы трэба сартаваць па народах, таўшчыні і даўжыні праз 4 сантыметры.

Зянькоўскі, Лошанскі і Песачанскі ву часткі ня выканалі загаду адміністрацыі. Пасьля гэтага дырэкцыя леспрамгасу ў другі раз прапанавала сартаваць лес ужо ў часе вязкі перад сплавам. Другі загад таксама ня выканал.

Такім чынам з-за поўнай безадказнасьці і нераспарадчасьці кіруючай часткі леспрамгасу і вучасткаў — сарвана важнейшае мерапрыемства па рацыяналізацыі і зьніжэньні сабекошту сплаву. Леспрамгас прымушан быў страціць значныя сумы на сартаваньне дроў на канчатковым пункце, без чаго немагчыма плянавая адгрузка лесаматар'ялаў.

Вінаватыя ў зрыве важнейшага мерапрыемства, у злосным невыкананьні загадаў беспакарана кіруюць вучлесгасы.

Трэба вызвіць канкрэтных посьбітаўла і прыцягнуць іх да судовай адказнасьці.

**Чырвоны біч.**

### Ліквідаваць настрої самацёку

**ВУЛА. (Па тэлегр.). Сплаў па Вульшчыне пад пагрозай зрыву з-за бязьдзейнасьці Віцебскай сплаўнай канторы. Няма рабочых для вязаньня плытоў. Не хапае гужбы і такелажу для сплаву лесаматар'ялаў унутранога спажываньня. Загадчык Полацкага аддзяленьня сплаўнай канторы ВАЎКОВІЧ праяўляе яўны апартуністычныя адносіны да сплаву, заяўляючы, што «сплаў пачынаць яшчэ рана, бо паводка ня спала».**

**Мясцовыя арганізацыі павінны прыняць усе меры для разгортваньня сплаўных работ.**

# Менск

### Замяніць імпартныя дубіцелі

**Фарсаваць загатоўкі дубільнай кары**

**Усім гарадзкім камітэтам і райкомам КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, Лесбеляу, Белкаапсаюзу, Саюзсныры і рэдакцыям газэт.**

Выраішэньне задачы абавязковай вамены ў гэтым годзе імпартных дубіцеляй для гарбарнай прамысловасьці патрабуе загатоўкі ў БССР 28.000 тон лазовай, яловай і дубовай кары.

Надаючы выключна важнае значэньне загатоўкам дубільнай кары, асабліва ў сувязі са спыненьнем імпарту дубіцеляй, што дасьць краіне дзесяткі мільёнаў руб. эканомі, ЦК КП(б)Б прапануе ўсім партарганізацыям мабілізаваць на выкананьне загатовак кары ўсю грамадзкасьць і у першую чаргу камсамольская арганізацыі, ператварыўшы загатоўкі ў масавую кампанію.

Райкомам партыі неабходна безадкладна праверыць работу ўсіх загатоўчых арганізацый і прыняць усе меры да забесьпячэньня поўнага выкананьня плянаў, улічваючы, што сэзон зьдзіраньня кары надзвычай кароткі — усяго адзін-паўтара месяца.

**Сэкратар ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ**

### На паляпшэньне быту рабочых

**Прэзыдыум Менскага гарсавету заслухаў даклад страхкасы аб разьмеркаваньні сродкаў на паляпшэньне быту рабочых.**

**У гэтым годзе страхкаса арганізуе дыетычнае харчаваньне на буйных прадпрыемствах Менску (завод «Бальшавік», імя Варашылава, ф-ка «Кастрычнік», абутковая фабрыка і друкарня імя Сталіна). Усяго на дыетхарчаваньне адпушчана 38.000 руб.**

**На пабудову лазьні ў горадзе адпушчана 120.000 руб. і на пабудову 2-х раённых пральняў—40.000 руб.**

**На паляпшэньне харчаваньня дзяцей рабочых у школах вызначана 18.000 р.**

**На дзіцячыя ўстановы адпушчана 60.000 руб., з іх на правядзеньне дзіцячай аздараўляючай кампаніі—15.000 руб.; па пашырэньне харчаваньня дзяцей застрахаваных—13.000 руб. і г. д.**

**У гэтым годзе намечана пабудаваць дом адпачынку «Пяты дзень ударніка» на 300 чал. На яго пабудову вызначана 400.000 руб.**

**Праз дом адпачынку ў Ждановічах за летні сэзон будзе прапушчана 5.000 застрахаваных і 300 дзяцей.**

**На курорты будзе паслана 190 застрахаваных і ў мясцовыя санаторыі—30 чал.**

**Прэзыдыум гарсавету даручыў камгасу, інспэкцыям асьветы і аховы здароўя, МЦРК і ЗРК прыняць усе меры да поўнай рэалізацыі мерапрыемстваў па паляпшэньні быту рабочых.**

### Спынена высылка датацыі раёнам

Наркамфін БССР спыніў высылку датацыі па мясцовым бюджэце тым раёнам, якія выканалі пляны мабілізацыі сродкаў ніжэй, чым на 25 проц., што адзначае зрыў выкананьня пляну. Высылка спынена да моманту, пакуль раён даб'ецца рашучага пералому ў галіне выкананьня заданьня за другі квартал. Да гэтых раёнаў адносяцца: Гарадоцкі, Смалявіцкі, Чавускі, Бялыніцкі, Чачавіцкі, Расьнянскі, Шклоўскі, Лагойскі, Чарэйскі, Хойніцкі і г. д. Таксама значна скарочан перавод датацый раёнам, якія дастаюць у вы кананьні фінпляну.

### Установы г. Менску не падрыхтаваліся да новай крэдытнай сыстэмы

Менгарсавет заслухаў даклад гарадзкога банку аб пераходзе прадпрыемстваў і ўстаноў на новую крэдытную сыстэму.

Прэзыдыум канстатаваў, што большасьць устаноў і прадпрыемстваў не падрыхтаваліся да новых умоў крэдытаваньня, у выніку на радзе прадпрыемстваў і ўстаноў стварыліся цяжкія фінансавыя абставіны.

Прэзыдыум прапанаваў усім кіраўнікам прадпрыемстваў і ўстаноў у 3-дзенны тэрмін перадаць банку дагавары і фінпляны.

На ўсіх сэкцыях гарсавету будуць зроблены даклады гарбанку аб крэдытнай рэформе.

Сэкцыям гарсавету прапанавана вылучыць брыгады для праверкі, як прадпрыемствы і ўстановы выконваюць дагавары.

На наступным пасяджэньні прэзыдыуму будуць заслуханы даклады асобных прадпрыемстваў і ўстаноў, якія не заключылі дагавароў і не перадалі банку фінпляны і дагавары.

### Забесьпячэньне Менску апалам

Прэзыдыум Менгарсавету зацьвердзіў плян забесьпячэньня гораду апалам на другую палову 1931 г. і на ўвесь 1932 г.

Паводле гэтага пляну вызначана папырыць перавод прадпрыемстваў і ўстаноў на тарфяны апал, у сярэдні да 25% у 1931 г. і да 50% — у 1932 г.

Забесьпячэньне ўстаноў і прадпрыемстваў апалам будзе правадзіцца непасрэдна загатоўшчыкамі, з якімі прадпрыемствы павінны на працягу мая заключыць дагавары. МЦРК будзе забясьпечваць апалам працоўнае насельніцтва.

Усім установам і прадпрыемствам прапанавана максымальна эканоміць апал і вызначыць адказных за гэту справу.

### Павышэньне загатоўчых цэн на ільнавалакно

Галоўленком і Ільнаканапляводцэнтр паведамляюць, што са згоды Наркамснабу Наркамзему Саюзу з 22 мая г.г. цэны на валакно, салому ільну і канапель як бягучых загатовак, так і загатовак ураджаю 1931 г. павышаюцца на 30 проц. супроць існуючых загатоўчых цэн. З адзначанага дня валакно і салома ільну і канапель будзе купляцца па новых павышаных цэнах

### Уцягненьне інвалідаў працы ў прамысловасьць і дзяржапарат

Ва ўмовах разгортваньня ўдарных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва і поўнай ліквідацыі беспрацоўя ў нас значна адчуваецца недахват кваліфікаванай рабочай сілы.

Наркампрацы, улічваючы жаданьне інвалідаў працы прыняць актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве, пастанавіў: скарыстаць гэтых інвалідаў на лёгкай рабоце.

ЦСПСР абвясьціў двухтыднёвік па ўцягненьні інвалідаў у прамысловасьць і дзяржапарат.

Галоўсаспстрах БССР пастанавіў уцягнуць у прамысловасьць адну тысячу ч. У савецкі апарат—900, у каапэрацыю, калгасы і саўгасы—1.700 інвалідаў.

На сёнешні дзень ужо ўцягнута ў прамысловасьць звыш 400 чал.; у дзяржаўны апарат і каапэрацыю—звыш 230 чал., у саўгасы і калгасы—каля 55, у інвалідную і саматужную каапэрацыю—каля 80 інвалідаў. Усяго ўцягнута каля 780 інвалідаў.

### Пачалі агляд газэт

У Камвузе Беларусі імя Леніна распачалася падрыхтоўка да ўсесаюзнага зьезду рабселькораў і месячніка друку. Пасьля абгаварэньня гэтага пытаньня партарганізацыяй вылучаны чатыры брыгады для агляду становішча друку ў камвузе: шматтыражкі «Ленінец» і насьценгазэт пры газэтным і яўрэйскім аддзяленьнях і пры курсах камсамольскага актыву. 17/V праведзена інструкцыйная нарада гэтых брыгад, разданы формы—анкеты.

**В. Жураўлёва**

### Тыраж лётарэі Асоавіяхіму

**25 мая ў Гомелі адбудзецца розыгрыш білетаў 4-га разраду ўсесаюзнай лётарэі Асоавіяхіму. Старшынёй тыражнай камісіі назначан старшыня Гомельскага гарсавету і савету Асоавіяхіму тав. ВЭНДЭ. У склад тыражнай камісіі ўваходзяць ударнікі і ўдарніцы з прадпрыемстваў саўгасаў і калгасаў Гомельшчыны, а таксама два прадстаўнікі ад Аршаншчыны і Мсьціслаўшчыны, дзе да тэрміну рэалізаваны ўсе білеты лётарэі.**

**Да тыражу прыстасоўваюцца стралковыя спаборніцтвы і скачкі. З 20 да 30 мая праводзіцца ўдарная дэкада па рэалізацыі білетаў лётарэі Асоавіяхіму.**

### На дапамогу пацярпеўшым ад зямлятрасеньня ў Савецкай Арменіі

**Калектыў СТУДЭНТАЎ КАМУНІСТЫЧНАГА УНІВЭРСЫТЭТУ БЕЛАРУСІ ІМЯ ЛЕНІНА па падпісным лісьце сабраў і ўнёс у карысьць пацярпеўшых ад зямлятрасеньня ў Савецкім Закаўказьзі 521 руб. і ў парадку сацспаборніцтва выклікаў усіх выкладчыкаў і служачых КУБ'у.**

**— Калектыў МЕНГАРФА, у адказ на выклік Менгарсавету, унёс 2 проц. месячнай зарплаты ў фонд дапамогі пацярпеўшым і выклікаў калектывы НКФ і Дзяржбанку.**

**— Праўленьне РАГАЧОЎСКАГА добраахвотнага пажарнага таварыства ўнесла ў фонд пацярпеўшым ад зямлятрасеньня ў Закаўкаскай ССР 54 руб. 80 кап., сабраныя з нападжанага гуляньня.**

**— Калектыў ВСНГБ сабраў 342 р.**

**— Ад работнікаў установы СМАЛЯВІЦКАГА раёну дадаткова паступіла 65 р.**

### Водгукі на заметкі

Сход камуністаў-жыхароў жаку № 11 вылучыў камісію для праверкі заметкі «Агідная безгаспадарчасьць жаку № 11», якая была зьмешчана ў газэце «Зьвязда», № 77. Камісія ўсталявала, што рамонт даху дому № 37 няма ніякай мэтазгоднасьці рабіць, бо дом, паводле пастановы гаркамгасу, ідзе на знос, а для таго, каб не працякаў дах, яго трэба палкам перакрываць. Праўленьне жаку настойліва дабівацца перад Гаркамгасам хутчэйшага перасьленьня жыхароў дому № 37. Камісія знайшла, што рамонт студзі зімою рабіць нельга было, а зараз яна ужо адрамантавана, што ўборка бруду зроблена ў пачатку вясны.

### Беллрамсаюз забыўся аб ахове працы

Ахова працы ў арцелях Беллрамсаюзу—у загоне. Нават маленькія мерапрыемствы, дзякуючы адсутнасьці ўвагі з боку мясцовых прафарганізацый і адміністрацыі, не праводзяцца ў жыцьцё. У арцелі «Пралетарыі» амаль ва ўсіх цэхах і аддзяленьнях сьнедаюць ля варштатаў, ня гледзячы на тое, што ёсьць магчымасьць абсталяваць пакоі пад сталоўкі. Ёсьць выпадкі, калі чай кіпяціцца ў іржавых чайніках.

Тое самае і ў арцелі «Чырвоны мэталіст». Ня гледзячы на абсьледваньні і паказаньні в боку санітарнай інспэкцыі, адміністрацыя арцелі да гэтага часу не прыняла мер да паляпшэньня становішча аховы працы.

**Санітарны дактар.**

### Паведамленьні

— 24-V у 10 гадз. раніцы ў культпроп ЦК выклікаюцца наступныя таварышы: Саевіч, Мельцэр, Суворaў, Краўчук, Нобалі, Крывіцкі. Просьба зьявіцца без спазьненьня.

— Мен. Гар. КК-РСІ сумесна з Гаркамгасам скліканць сёньня, 23 мая, а 1-й гадзіне дня, у памяшканьні Гаркамгасу (Рэвалюцыйная, 15) нараду старшынь праўленьня ЖАКТ'аў і культсэкратараў. Яўка абавязкова.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

## За сустрэчны плян сплаву!

### За лясную пяцігодку—за 3 гады!

*Адозва віцебскіх ударнікаў--лесарубаў*

Мы, ударнікі віцебскага леспрамгасу, сабраліся з 4-х раёнаў на зьлёт для падагуленьня вынікаў выкананьня прамфінпляну за першы квартал і сацдагавору з Гарадоцкім і Бешанковіцкім леспрамгасамі.

Абгаварыўшы заклік тульскіх рабочых, мы заяўляем, што ў далейшым мы БУДЗЕМ УПАРТА ЗМАГАЦЦА ЗА ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ ЛЕСАЗАГАТОВАК, СПЛАВУ І ПАДСОЧКІ.

У АДКАЗ НА ХЛУСЬНЮ КАПІТАЛІСТАЎ АБ ПРЫМУСОВЫХ РАБОТАХ У ЛЕСАРАСПРАЦОЎКАХ, МЫ З ГОНАРАМ АДЗНАЧАЕМ ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ ПЕРШАГА І АСОБНАГА КВАРТАЛУ ПА ЛЕСАЗАГАТОЎКАХ: заданьне па загатоўках будаўнічай драўніны выканана на 159,6 проц., па загатоўцы дроў — на 101,5 проц.; заданьне па вывазцы лесаматар'ялаў выканана на 108,2 проц., па вывазцы дроў — на 117,5 проц.

Гэтыя паказальнікі дасягнуты намі, ЗЯКУЮЧЫ ЎЖЫВАНЬНЮ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ФОРМ І МЭТАДАЎ ПРАЦЫ — САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА. Мы абавязваемся выканаць гадовы плян трэцяга рашаючага году на працягу другога кварталу і высоўваем ДАДАТКОВЫЯ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН НА ТРЭЦІ І ЧАЦЬВЕРТЫ КВАРТАЛЫ па загатоўцы будаўнічай драўніны — на 30 проц., дроў на 20 проц. гадавой праграмы 1931 году, па вывазцы будаўнічага лесу — на 20 проц., дроў — на 25 проц. пляну 1931 году. Мы давядзем наш сустрэчны плян да кожнай брыгады лесарубаў, каб кожны лесаруб ведаў сваё заданьне. Мы арганізуем новыя капёны ўдарнікаў імя 518 і 1.040 ўсебеларускага зьезду прафсаюзаў.

Прымаючы пад увагу напружанае становішча з забесьпячэньнем усесаюзнай качагарні Данбасу крапежным лесам АБАВЯЗВАЕМСЯ ВЫКАНАЦЬ ГАДАВУЮ ПРАГРАМУ ПА ЗАГАТОЎЦЫ РУДНІЧНАЙ СТОЙКІ НА 150 ПРОЦ.

Мы бярэм на сябе абавязак выканаць плян па лесаагаспадарцы і падсочцы, па лесаднаўленьні, уцягваючы ў гэту работу ўсю грамадзкасьць вёскі.

Мы бярэм на сябе абавязак ЗАВЕРБАВАЦЬ ПА КОЖЫМ ВУЧЛЕСГАСЕ НЯ МЕНШ 30 ПАСТАЯННЫХ РАБОЧЫХ з бядняцка - батрацкай часткі вёскі і ўсю работу ў лесе перавесьці на брыгадныя мэтады, дасягнуўшы максымальнай прадукцыйнасьці працы (НЯ МЕНШ 5 КБМ. У ДЗЕНЬ).

Абавязваемся забясьпечыць поўнае і свайчасовае выкананьне пляну, захаваць матар'ял ад аварый і ўсушкі, даставіць яго ў поўным парадку на месца назначэньня.

Мы бярэм на сябе абавязак арганізаваць ня менш аднаго калгасу ў кожным вучлесгасе, забясьпечыўшы посьпех правядзеньня другой бальшавіцкай вясны.

У мэтах ажыцьцяўленьня пёзынгу тав. Сталіна аб аўладаньні тэхнікай мы прапануем арганізаваць пры кожным рабочкоме вытворчыя гурткі, прыцягнуўшы спэцыялістаў для кіраўніцтва імі.

БОРКАВІЦКІ, БЫХАЎСКІ, ГЛУСКІ, ЛЕПЕЛЬСКІ, НЁМАНСКІ І ТУРАЎСКІ ЛЕСПРАМГАСЫ НЯ ВЫКАНАЛІ СВАЙГО ПРАМФІНПЛЯНУ. Мы пытаемся ў таварышоў рабочых і спэцыялістаў гэтых леспрамгасаў, ці ўявілі яны сабе, што невыкананьнем пляну яны тармозяць пабудову новых фабрык і заводаў, што яны маюць вялікую запазычанасьць перад дзяржавай. Мы патрабуем ад іх неадкладна зьняць з сябе ганебную пляму і стаць у рады байцоў за перавыкананьне прамфінпляну.

ПРОСІМ УРАД, У МЭТАХ ПАСКАРЭНЬНЯ ТЭМПАЎ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ КРАІНЫ, ВЫПУСЬЦІЦЬ НОВУЮ ПАЗЫКУ ІМЯ ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ.

Атрыманыя намі прэміі ад Лесбелу і беларускага камітэту саюзу лесдрэўрабочых будуць скарыстаны для паглыбленьня культурна-масавай работы, клясавага выхаваньня мас лесарубаў, павароту культпрацы да вытворчасьці.

Мы запэўняем ЦК КП(б)Б, СНК, што ўдарнікі віцебскага леспрамгасу, пад балявым сьцягам ленінскай партыі, будуць і надалей змагацца за перавыкананьне прамфінпляну, даючы рашучы адпор апартуністам, панікёрам і малаверам.

За лясную пяцігодку — за 3 гады.

За новыя перамогі на фронце загатовак і лесасплаву!

47 ПОДПІСАЎ.

*Справа, якой павінна заняцца пракуратура рэспублікі*

## 8 МЕСЯЦАЎ МАРЫНУЮЦЬ КАШТОЎНАЕ ВЫНАХОДНІЦТВА

### Абяцаньні Альфіровіча і Рыжыкова былі простым „очковтирательством"

**Узброіць неадкладна запалкавую прамысловасьць новым удасканаленьнем**

На скрынках запалак можна бачыць этыкеты з малюнкам фабрычнай маркі і назвай фабрыкі, якая выробляе гэтыя запалкі. Бялкі шлях праходзіць паперка-этыкетка. Вагонамі дастаўляецца этыкетная папера разьмерам друкаванага аркушу па запалкавыя фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна» і «Пралетарская перамога». Са складаў фабрык папера адвозіцца ў друкарню, дзе на звычайных машынах друкуюцца патрэбныя этыкеты. Пасьля гэтага лісты зноў пакіроўваюцца на фабрыку.

На фабрыцы стаяць дзьве разальныя машыны і разразаюць аркушы паперы на маленькія кавалкі разьмерам запалкавай скрынкі. Дзьве работніцы вяжуць этыкеткі ў пачкі і перадаюць у этыкетны цэх. 60 работніц па 30 машынках у адну зьмену наклейваюць этыкеткі на гатовыя скрынкі. Звычайна скрынкі паміж сабою склейваюцца і 18 работніц у кожную зьмену спэцыяльна разрываюць склееныя скрынкі.

Да гэтага часу ўсе гэтыя працэсы лічыліся законам. З году ў год фабрыкі выдаткоўвалі **сотні тысяч рублёў** на этыкетную паперу, друкаваньне, апрацоўку і г. д.

І вось, у мінулым годзе два ўдарнікі фабрык «Чырвоная Бярэзіна» і «Пралетарская перамога» т. т. **Пашкевіч і Падоксік** вынайшлі прыбор, які дае магчымасьць ліквідаваць рад працэсаў і, паводле мінімальных падлікаў, павінен даць на аднэй фабрыцы «Пралетарская перамога» **каля 150.000 руб. эканоміі ў год.**

«Зьвязда» ад 10 кастрычніка 1930 г. падрабязна пісала аб гэтым вынаходніцтве і выкрыла нядбайныя адносіны да рэалізацыі вынаходніцтва з боку запалкавага аб'яднаньня. Дырэктар фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна» т. Альфіровіч і дырэктар запалкавага аб'яднаньня т. Рыжыкаў у сваіх лістох у «Зьвязду» пісалі, што вынаходніцтва Пашкевіча і Падоксіна мае вялікае значэньне для запалкавай прамысловасьці БССР і СССР і абяцалі аказаць вынаходцам патрэбную дапамогу для ажыцьцяўленьня вынаходніцтва. **З таго часу прайшло ўжо 8 месяцаў, але справа ня зрушылася з месца.**

На фабрыцы вынаходцам **ня была аказана ніякая тэхнічная дапамога.** Толькі два старыя сьлесары фабрыкі **разам з вынаходцамі на працягу ўсяго часу працавалі над вынаходніцтвам.** Зараз усе спробы скончаны. **Вынікі надта добрыя.** Зроблены прыбор прымацаван да клеельнай машынкі і этыкетная паперка друкуецца тут-жа на машынцы. Кошт прыбору зусім нязначны. Для ўсіх машынак фабрыкі ўстаноўка такіх прыбораў абыйдзецца каля 2-х тыс. руб.

Вынаходзтва скарачае працэс друкаваньня этыкетак, дае магчымасьць на 50 проц. скараціць рабочую сілу ў этыкетным цэху (амаль на 150 чал., якім можна даць іншую работу), эканоміць клей і энэргію. Апрача ўсяго гэтага, вынаходніцтва з'эканоміць каля **80 тон паперы** ў год на аднэй толькі фабрыцы «Пралетарская перамога». Таксама значна будзе зьніжан процант браку этыкетнага цэху.

Ня гледзячы на нядбайныя адносіны з боку кіраўніцтва фабрык запалкавага аб'яднаньня і аддзелу рацыяналізацыі ВСНГ, настойлівыя выпаходцы давялі сваю справу да канца.

Але зараз паўстае пытаньне **аб масавым прыстасаваньні гэтага вынаходніцтва.** Аднак, ніхто не клапаціцца аб рэалізацыі вынаходніцтва. **Адміністрацыя нават не прадастаўляе тэхнічных сіл для тэхнічнага афармленьня вынаходніцтва.**

Такія адносіны да падзвычайна каштоўнага вынаходніцтва зьяўляюцца злачынымі **і мяжуюць са шкодніцтвам. Пракуратура рэспублікі павінна неадкладна зацікавіцца гэтым пытаньнем і выявіць вінаватых.**

Ад ВСНГ мы патрабуем неадкладна паслаць патрэбную колькасьць тэхнічных работнікаў для афармленьня вынаходніцтва **і арганізацыі масавага вырабу ўдасканаленьня на адным з мэталязаводаў.**

Запалкавая прамысловасьць павінна ў самы бліжэйшы-ж час атрымаць магчымасьць перайсьці на новы спосаб работы, трэба таксама неадкладна перадаць гэтае вынаходніцтва рэдакцыі картатэкі «СО» (сацыялістычны абмен вытворчым вопытам,—беларускі пост знаходзіцца пры ЦСПСБ) для перанясьненьня вынаходніцтва па ўсю запалкавую прамысловасьць Савецкага Саюзу.

**Я. Ф-ко**

**24 мая роўна а 7 гадз. увечары ў памяшканьні рэдакцыі газэты „ЗЬВЯЗДА"**

**АДБУДЗЕЦЦА**

**Нарада па пытаньнях падрыхтоўкі другога ўсебеларускага зьезду рабселькораў**

На нараду запрашаюцца рабкоры-ударнікі, гаспадарнікі і спэцыялісты мэталяапрацоўчых прадпрыемстваў гор. Менску.

**Рэдакцыя газэты «ЗЬВЯЗДА»**


„Чырв. Зорка" Пач. 7:3-45;10-30 — З 20 мая новы цікавы фільм УСЁ СПАКОЙНА... Драма ў 7 частках

„Культура" Пач 1 с. у 7 гадз. — 2 фільмы ў адзін сэанс 2 1) Чырвонцы ў 5 частках 2) Сімба ў 5 частках

Інтэрнацыянал Пач. 1 с. у 7 г. — З 20 мая замежны фільм ЭЛЕКТРЫЧНАЕ КРЭСЛА Драма ў 7 частках.

„Пралетарый" Пач. у 7 гадз. — Мой сын Драма ў 6 част. Амерык. камэдыя Гэта ён у 2-х част.

„Юны Піянэр" Пач. 1 с. у 1 г. — Пат і Паташон на моры Арыгінальная камэдыя ў 2-х част. Звыш праг.-часопіс № 7.

„СПАРТАК" Пач. у 6-30; 8; 9-30 і 1 Касы — з 6 гадз. — З 11-га мая выдатны фільм ПРАСТЫТУТКА драма ў 7 частках.

25 чэрвеня — адкрыцьцё Ўсебеларускага зьезду рабселькораў — 25 чэрвеня

Першая ўдарная кіно-брыгада імя ЦО КП(б)Б „Зьвязда" рыхтуе да адкрыцьця зьезду фільм, прысьвечаны работе другу

ГУРАГАН

Сцэнары Б. Брадзянскага і Г. Кобеца

РЭЖЫСОР В. ВАЙНШТОК. АПЭРАТАР А. КАЛЬЦАТЫ.

Сад „ПРАФІНТЭРН"

24 мая адкрыцьцё летняга сэзону

Адкрыт валёдром — ВЯЛІКАЕ ГУЛЯНЬНЕ — Функцыянуюць:

Масавае катаньне на вялёсыпэдах. Штодзённа адкрыта чытальня. Ад 12 да 4 г. дня і ад 7 да 10 г. веч. ФУНКЦЫЯНУЕ ЛЕТНІ ТРАТР

Кательбэн, фігурны цір, кракет, пінг-понг. Тэнісныя корты. Буфэт, кіёскі з напіткамі. Шахматы і шашкі.

Сад радыёфікаваны.—У 10 гадз. веч.—кіно.

Штодзённа грае духавы аркестр у ліку 40 чалавек. (М-скага стр. палка пад кіраўніцтвам капэльмэйстра ПАПЛЯУСКАГА). Рэпэртуар штодзённа новы. Цана ўваходнага білету 25 к. Зь карыстаньне валёдромам—10 к. Каса адкрыта ад 6 гадз. веч.

УВАГА: Пры садзе арганізуецца культ.-мастацкі савет з добраахвотнікаў — наведвальнікаў саду. Запіс у заг. саду.

МОПРАЎЦЫ МЕНСКУ!—НА ДАПАМОГУ ПРЫГАРАДНЫМ ГАСПАДАРКАМ МЦРК

Удзелам у засеве прыгарадных гаспадарак—павялічым матар'яльную дапамогу барацьбітам рэвалюцыі

Ніводнага незасеянага гектара прыгарадных гаспадарак—лёзунг мопраўцаў г. Менску.

Менскі гарком МОПР'у арганізоўвае 25 і 26 мая масавы выхад МОПР'аўцаў у прыгарадныя гаспадарні МЦРК для дапамогі ў засеве.

Усе МОПР'аўцы, вольныя ад сваёй работы, заклікаюцца выйсьці на работы ў прыгарадныя гаспадаркі.

Збор у 7 гадз. раніцы 25 і 26 мая ў памяшканьні ЦК МОПР'у БССР (Савецкая 67, другі паверх).

Харчаваньнем удзельн. забясьпечаны МЕН. ГК. МОПР'у.

КАМАРЫНСКІМ РК КП(б)Б

склікаецца 31 мая, у 11 гадз. раніцы, у м. Камарыча

раённы зьлёт рабселькораў.

Парадак дня: 1) Выніці ўсесаюзнай рабселькораўскай нарады і пастанова ЦК аб рабселькораўскім руху. 2) Нізавы друк і яго роля ў сацыялістычнай перабудове вёскі. На зьлёт павінны зьявіцца селькоры, насьценкоры, юнкоры, члены рэдкалегій насьценгазэт, хатнікі, сакратары парт.-камсам. ячэек.

АДКРЫТ ПРЫЁМ У БАБРУЙСКУЮ ШКОЛУ ФЗВ

пры дрэваапрацоўчым камбінаце.

У школу прымаюцца асобы абодвых родаў ад 15 з паловай да 17 год дзеці рабочых, калгасьнікаў, батракоў, беднякоў, серадняковаў, служачых і саматужнікаў з асветай ня ніжэй 7-годкі. Прыём заяў працягнецца **да 1-га ліпеня** г.г. Заявы прымаюцца ў канцылярыі ФЗВ—г. Бабруйск, дрэваапрацоўчы камбінат. Да заяў'ў выкладаюцца наступныя дакументы: 1) аб сацыяльным становішчы, 2) аб асьвеце, 3) аб узросьце, 4) аб фіз. стане і 5) аб праве голасу. Вучні будуць забясьпечаны інтэрнатам і зарплатай.

Дырэктар Камбінату **Эйдэльштэйн.** Загадчык ФЗВ **Лернэр.**

ПРАЎЛЕНЬНЕ МЦРК даводзіць да ведама ўсіх ФЗМК, што

ЗАНЯТКІ на курсах прадвўцаў прыгаўку

Пачынаюцца 25 мая роўна а 1-й гадзіне дня ў Доме Чырвонай Арміі па вул. Энгельса.

Тыя ФЗМК, якія **не прадставілі анкеты, павінны прадставіць да 25-га мая МЦРК.**

КІРАЎНІЦТВА ПЛЯНАВЫХ КАДРАЎ ДЗЯРЖПЛЯНУ БССР

адкрывае з 10-VI 31 г. 2-МЕСЯЧНЫЯ ПАДРЫХТОЎЧЫЯ КУРСЫ

ў плянава-эканамічны тэхнікум Дзяржпляну БССР (які распачынае заняткі з 1-IX 31 г). На курсы ў першую чаргу прымаюцца рабочыя і іх утрыманцы, якія маюць веды ў аб'ёме 5—6 клясаў 7-годкі ва ўзросьце ад 15 да 25 год. Заявы будуць прынята з 25 мая па 6 чэрвеня г. г. у памяшканьні кіраўніцтва плянавых кадраў—**г. Менск, Плошча Волі № 5